ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.
18 МАЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 92 (28456)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Прафесія не для кожнага**



**Мастак з плойкай у руках**



**Піянеры — 95!**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Эдвард МАТУЛІС, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Нагадаю, што летась урад Расіі прыняў пастанову, у адпаведнасці з якой удзельнічаць у закупках дзяржаўных карпарацый не могуць замежныя вытворцы. Безумоўна, у беларускіх прадпрыемстваў і прадпрыемстваў іншых дзяржаў — удзельніц ЕАЭС паўсталі пытанні. І вось на днях мы атрымалі афіцыйны ліст Мінэканамразвіцця РФ, у якім паведамляецца, што прадпрыемствы і тавары краін — удзельніц ЕАЭС усё ж будуць дапускацца да закупак дзяржкарпарацый Расіі на тых жа ўмовах, што і расійскія тавары. Дарэчы, рынак закупак расійскіх дзяржкарпарацый ацэньваецца не менш чым у $150 млрд».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8583 | ▲ |
| Еўра | 2,0618 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0703 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17092
9 771990 763008

# КОТ&КОТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У гэтым доме часцей за ўсё гучыць слова «кот». Тут жыве шматдзетная сям'я КОТ — гаспадары Алег і Святлана і іх пяцёра дзяцей. Столькі ж на падворку і вусатых гадаванцаў. У вёсцы Дзедаўка Жыткавіцкага раёна гэты дом самы вядомы, бо на яго фасадзе намалявана шмат розных жывёл.**

**Гэтак незвычайна сваё захапленне маляваннем дэманструе гаспадыня Святлана — мастак-аматар. Вядома, знайшлося месца ў «незвычайнай галерэі» і хатняму пестуну — кату. На гэтым фотаздымку Святлана Кот з дзецьмі Янай, Алесяй і малодшым Аляксеем побач з «фамільным» партрэтам.**

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

## З РОДУ АМЕЛЬЯНЮКОЎ

**Роўна 75 гадоў таму ў акупаваным Мінску выйшаў першы нумар падпольнай «Звязды». А напярэдадні гэтай даты мы знайшлі блізкіх сваякоў яе гераічнага рэдактара**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**У тым самым месцы, каля Чырвонага касцёла ў Мінску, дзе загінуў галоўны рэдактар першага падпольнага нумара «Звязды», стаіць помнік журналісту-падпольшчыку. Надзея АМЕЛЬЯНЮК, пляменніца героя, разам са сваім мужам Міхаілам Васілевічам прыходзяць сюды кожны май, які стаў для іх сям'і трагічным.**

**Гэтая знамянальная падзея ў жыцці Мінскага падполля многім каштавала жыцця. Найперш — учарашняму студэнту Мінскага камуністычнага інстытута журналістыкі Уладзіміру Амельянюку, які стаў рэдактарам газеты ў свае няпоўныя 25 гадоў.** СТАР. 4

■ Эканамікс

## Замежныя інвестары выбіраюць Беларусь

**На Віцебскім VI Міжнародным эканамічным форуме «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы» дзелавыя людзі, навукоўцы, эколагі з больш чым 10 краін абмяркоўвалі планы і падпісвалі дагаворы. А галоўнае — дэманстравалі канкрэтныя вынікі супрацоўніцтва.**

### Падтрымка гарантуецца

Перад пачаткам бізнес-мерапрыемства адбылася прэзентацыя завода групы кампаній Modern-Expo па вырабе гандлёвага абсталявання. Сярод яе кліентаў Nestle, MacDonalds, PepsiCo, British American Tobacco, Mars, Henkel і іншыя транснацыянальныя кампаніі. А пачыналася ўсё ў 1993 годзе са стартапу ў польскім гарадку Люблін. Працягнулася ва Украіне...

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Польшчы Конрад ПАЎЛІК**, падкрэсліў, што праект у Віцебску рэалізуецца на высокім узроўні, а магчымасці супрацоўніцтва дзвюх краін вялікія. Пасольства актыўна спрыяе пашырэнню эканамічных сувязяў і наладжванню дзелавых кантактаў.

Паводле слоў **кіраўніка згаданага вышэй холдынга Пятра ПІЛІПЮКА**, у Беларусі самыя прывабныя ва Усходняй Еўропе ўмовы для інвестыцый. Камерцыйны поспех гарантуе і тое, што наша краіна — член ЕАЭС. На вялікай тэрыторыі Мытнага саюза можна без праблем пастаўляць заказчыкам неабходнае ім абсталяванне. Прадукцыю з Беларусі чакаюць і ў ЕС. Больш як 200 гараджан ужо атрымалі прэстыжную працу з добрай аплатай. А пасля запуску другой чаргі вытворчасці будуць створаныя новыя працоўныя месцы. СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПРЭЗІДЭНТ СУСТРЭНЕЦЦА З КІРАЎНІКОМ СЕРБІІ

Сёння Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Палацы Незалежнасці правядзе сустрэчу з Прэзідэнтам Сербіі Тамілславам Нікалічам, які 17—18 мая знаходзіцца ў Беларусі з рабочым візітам, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць стан беларуска-сербскіх адносін, рэалізацыю інвестыцыйных праектаў і вынікі супрацоўніцтва за апошнія некалькі гадоў. Прэзідэнты таксама абмяняюцца думкамі па палітычным парадку дня і іншых актуальных пытаннях.

■ Меркаванне

# АДНЫМ ШЛЯХАМ З КІТАЕМ



14—15 мая ў Кітаі прайшоў саміт у рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Гэтая ініцыятыва, якая была вылучана і абгрунтавана ў 2013 годзе, з'яўляецца найважнейшай на працягу апошніх дзесяцігоддзяў знешнеэканамічнай канцэпцыяй Пекіна. Яна памяншыць рызыкі і адлегласці паміж традыцыйнымі і новымі, але не менш важнымі гандлёвымі партнёрамі Кітая ў нестабільны час XXI стагоддзя. Пры дапамозе гэтай канцэпцыі марскія шляхі, якія больш танныя, але маюць больш рызык з пункту гледжання геапалітычных праблем, дублююцца як на моры (праз адкрыццё новых партоў і пракладванне новых гандлёвых маршрутаў), так і на сушы. У выніку рэалізацыі ініцыятывы найбуйнейшы экспарцёр свету — Кітай — будзе больш надзейна звязаны са сваімі гандлёвымі партнёрамі. Адначасова пастаўшчыкі тавараў на кітайскі рынак, у тым ліку крытычна важных для функцыянавання кітайскай эканомікі, таксама паляпшаюць свой доступ да рынку КНР. У выйгрышы аказваюцца ўсе, хто жадае больш узаемадзейнічаць з магутнай і ўсё больш інавацыйнай кітайскай эканомікай, страчваюць толькі тыя, хто рады дэстабілізацыі ў Еўразіі, клапоцячыся аб уласных эгаістычных мэтах.

Канцэпцыя «Адзін пояс, адзін шлях» будзе ва ўсё большай ступені ўплываць на эканоміку, гандаль і занятасць у Беларусі. Наша краіна яшчэ з 1990-х выступала за самыя цесныя кантакты з кітайскай эканомікай. Не маючы выхаду да сусветнага акіяна, беларуская эканоміка пакутуе ад недахопу хуткіх і танных гандлёвых камунікацый. Пры дапамозе ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» Беларусь атрымае шмат новых камунікацыйных каналаў для развіцця тавараабароту, зможа танней экспартаваць і імпартаваць камплектуючыя і тавары, што выкліча рост цікавасці інвестараў і з'яўленне новых працоўных месцаў у самых розных сферах эканомікі.

Рэалізацыя ініцыятывы паслужыць і мэтам актывізацыі эканамічных адносін з КНР. Добразычлівае стаўленне Беларусі да гэтай важнай для кітайскага кіраўніцтва канцэпцыі ацэньваецца ім па заслугах. Беларуская дзяржава, размешчаная ў цэнтры Еўропы, прынясе дывідэнды ў рэалізацыі новага кітайскага праекта для ўсіх удзельнікаў за кошт больш кароткіх, і, такім чынам, больш выгадных па цане маршрутаў перавозкі тавараў. У наступныя гады сувязі з кітайскай эканомікай будуць станавіцца ўсё больш цеснымі, што дазволіць прыцягнуць з Кітая сучасныя інавацыі і хутчэй мадэрнізаваць беларускую эканоміку.

Паколькі цэнтр сусветнай фінансавай і эканамічнай актыўнасці з кожным годам усё больш зрушваецца ў Азію, ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» дапаможа еўрапейскай Беларусі лягчэй пранікаць на азіяцкія рынкі і прыносіць сваім удзелам у праекце карысць азіяцкім удзельнікам, што выкліча крокі ў адказ з іх боку. Чым больш грузаў і пасажыраў будзе перасякаць беларускую тэрыторыю ў рамках развіцця праекта, тым больш будзе і інтарэсу ў інвестараў задумвацца аб укладах у беларускую эканоміку. Мы перастанем быць малавядомай у Азіі краінай, што вельмі важна, паколькі азіяцкія інвестары не любяць рызыкаваць і рэдка выбіраюць для інвестыцый краіны, пра якія ў іх мала інфармацыі. З іншага боку вынікам рэалізацыі ініцыятывы стане ўсё большае інфармаванне беларускіх бізнесменаў аб магчымасцях на азіяцкім напрамку. На гэтым рынку, які займае 30 працэнтаў зямной паверхні, жыве 4,4 мільярда спажыўцоў планеты. Рынак хутка расце, а беларускія тавары там амаль не прысутнічаюць. Гэта вялізная хіба будзе ліквідавана, калі ў рамках рэалізацыі новай кітайскай ініцыятывы для беларускага бізнесу продаж тавараў у Кітаі ці Японіі, Інданезіі ці Індыі стане штодзённасцю.

Ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» таксама створыць дадатковыя стымулы для суседзяў Беларусі цаніць яе як найважнейшы лагістычны вузел, пры дапамозе якога яны будуць зарабляць больш грошай. Усё больш і больш кантэйнерных і пасажырскіх цягнікоў, патокаў турыстаў на цягніках і самалётах будуць рухацца цераз тэрыторыю Беларусі. Гэта нарастаючае значэнне ключавога лагістычнага вузла ў цэнтры Еўропы прымусіць суседзяў цаніць і падтрымліваць бяспеку і стабільнасць на беларускай тэрыторыі.

Прынцыпова важна, што новая кітайская ініцыятыва сустракае гарачае адабрэнне з боку кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, якая з прычыны памераў сваёй тэрыторыі стане адным з галоўных атрымальнікаў выгад ад рэалізацыі канцэпцыі КНР. Гэта дазволіць ажыццяўляць праекты па развіцці інфраструктуры не толькі ў рамках супрацоўніцтва Мінска і Пекіна, але і Масквы. Да шэрагу праектаў падключыцца і Казахстан, што дазваляе гаварыць не толькі пра рэалізацыю беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, але і пра далучэнне ключавых краін ЕАЭС да развіцця камунікацый у рамках умацавання еўразійскай інтэграцыі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

■ Парламенцкі дзённік

# Чаканыя сумы кантрактаў — не ніжэй за $300 млн

**Аб гэтым заявіў Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на пашыранай нарадзе па пытаннях падрыхтоўкі чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на тэму інавацый і высокіх тэхналогій. Удзельнікі дэталёва разгледзелі праграму, пытанні правядзення пленарнага і секцыйных пасяджэнняў, а таксама праект выніковага дакумента Форуму.**

— Мерапрыемствы вельмі адказнае. Гэта, безумоўна, пляцоўка для актуалізацыі пытанняў саюзнага будаўніцтва, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Асаблівую ўвагу мы павінны ўдзяляць пытанням эканамічнага супрацоўніцтва.

Таксама Міхаіл Уладзіміравіч дадаў, што ў рэгіёнаў велізарны патэнцыял. На чацвёртым форуме трэба пастарацца, каб сумы камерцыйных кантрактаў былі не ніжэйшыя за папярэднія, якія склалі 230 і больш за 300 мільёнаў долараў на 2-м і 3-м форумах.

Незвычайны характар мае праграма форуму. «Асаблівасць заключаецца ў тым, што ў гэтыя дні будуць праходзіць яшчэ два вельмі важных мерапрыемствы: намечана пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы і адначасова будуць праходзіць Дні навукі Беларусі ў Расійскай Федэрацыі. Форуму рэгіёнаў будзе папярэднічаць шэраг навуковых мерапрыемстваў. Дні навукі павінны разглядацца як складальная частка форуму, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Другая асаблівасць заключаецца ў перспектыўным парадку дня. Гэта новыя прарыўныя тэхналогіі і пытанні маладзёжнай палітыкі». Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі даручыў аргкамітэту ўдзяляць асаблівую ўвагу выкананню выніковых дакументаў, падпісаных на папярэдніх форумах.

— Сёння ўжо рыхтуюцца да падпісання — яны ў рабоце — каля 60 пагадненняў розных напрамкаў паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі, — адзначыла **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні чацвёртага Форуму рэгіёнаў Марыяна ШЧОТКІНА.** — І сёння каля 60 удзельнікаў выстаўкі беларускай прадукцыі ўжо заявілі сябе.

Марыяна Акіндзінаўна падкрэсліла, што кожны экспанат павінен быць прафільтраваны і адпавядаць тэме форуму, паколькі на самой выстаўцы беларускаму боку вызначана дзве тысячы квадратных метраў. «Мы павінны зыходзіць з таго, каб гэта быў важны напрамак дзейнасці і каб гэта было тое, на што цікава паглядзець», — дадала віцэ-спікер верхняй палаты.

Чацвёрты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі на тэму «Вектары інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства» адбудзецца 29—30 чэрвеня ў Маскве ў Цэнтральным выставачным комплексе «Экспацэнтр». У пленарным пасяджэнні плануецца ўдзел Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

# Сацыялка, дзяржзакупкі і ваенна-прамысловае супрацоўніцтва

## Законапраекты ў гэтых кірунках разгледзела ўчора Палата прадстаўнікоў

**Сацыяльныя паслугі стануць больш даступнымі, а айчынныя прадпрыемствы-экспарцёры атрымаюць доступ да велізарнага рынку дзяржаўных закупак Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Дэпутаты таксама ратыфікавалі міжурадавае пагадненне аб ваенна-прамысловым супрацоўніцтве з Балівіяй. Прынятыя нарматыўныя акты пойдуць на карысць дзяржаве як у сацыяльным, так і ў эканамічным плане.**

### На кожную двойню — нянька

**Таццяна СТАРЫНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, прадставіла дакумент, які ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні».** Яна пералічыла галоўныя навацыі.

Па-першае — удакладняюцца асобныя тэрміны, напрыклад «цяжкае жыццёвае становішча» і «сацыяльны праект», — паведаміла дэпутат. — Напрыклад, цяжкай жыццёвай сітуацыяй сёння з'яўляецца нараджэнне адначасова дваіх і болей дзяцей, чаго не было ў законе. У такім выпадку сям'я будзе мець права на бясплатную няньку.

Па-другое, некамерцыйныя недзяржаўныя арганізацыі атрымаюць права ўдзельнічаць у вырашэнні пытанняў у галіне сацыяльнага абслугоўвання.

Па-трэцяе, упершыню ўводзіцца такі тэрмін, як замяшчальная сям'я. Гэта калі паўналетні непрацаздольны грамадзянін мае права весці агульную гаспадарку з тым, хто будзе яго даглядаць. Але паміж імі не павінны быць адносіны, якія абавязваюць даглядаць непрацаздольнага. Гэта дапаможа нам яшчэ больш ахапіць грамадзян, што маюць неабходнасць у сацыяльных паслугах. Сёння кожны пяты грамадзянін атрымлівае сацыяльныя паслугі — гэта каля двух мільёнаў чалавек, — канстатавала Таццяна Старынская.

### 300-мільярдны рынак

**Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** растлумачыў сутнасць ратыфікацыі Пратакола паміж дзяржавамі — удзельніцамі Дагавора аб зоне свабоднага гандлю ад 18 кастрычніка 2011 года аб правілах і працэдурах рэгулявання дзяржаўных закупак:

— Прадмет дзяржзакупак заўсёды выклікае вялікія абмеркаванні, пытанні, таму што гэта закупкі, якія рэгламентуюцца дзяржавай, закупкі за кошт нас, падаткаплацельшчыкаў. Таму вельмі важна выпрацаваць адзіныя прынцыпы, якія функцыянавалі б на тэрыторыі ўсіх краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Пратакол, які быў падпісаны ў Бішкеку, якраз служыць рэалізацыі гэтых падыходаў. Будуць роўныя ўмовы для работы нашых прадпрыемстваў у сферы дзяржзакупак сярод удзельнікаў з краін СНД. Уводзяцца адзіныя прынцыпы падачы заявак, фарміравання ўмоў аб'яўлення дзяржзакупак. Пры гэтым уводзіцца электронны фармат забеспячэння празрыстасці гэтых здзелак і даступнасці для нашых суб'ектаў гаспадарання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Германія ўвядзе кантроль на межах падчас саміту G20

Праверкі абумоўлены «павышанымі патрабаваннямі да бяспекі», паведамляе газета Die Welt са спасылкай на МУС краіны. Саміт G20 пройдзе ў Гамбургу 7—8 ліпеня. Дадатковым аргументам на карысць увядзення кантролю з'яўляецца прадухіленне ўезду ў краіну левых радыкалаў з Даніі і Італіі, як гэта адбылося, напрыклад, на саміце G7 у баварскім замку «Эльман».

### Хакеры выкралі ў сеціва вірус, выкрадзены ў спецслужбаў ЗША

Гэты вірус можа быць выкарыстаны для крымінальных нападаў на камп'ютары, якія выкарыстоўваюць аперацыйную сістэму Windows, паведаміла газета Financial Times. «Інструмент для хакерскіх аперацый, распрацаваны Агенцтвам нацыянальнай бяспекі (АНБ) ЗША і названы EsteemAudit», — піша выданне са спасылкай на аналітыкаў у галіне бяспекі. Газета звяртае ўвагу на тое, што «сакрэтная кіберзброя была выкладзена ў так званым цёмным сегменце інтэрнэту пасля таго, як вірус-вымагальнік WannaCry, атакаваў 12 мая камп'ютары па ўсім свеце і прадэманстраваў высокую эфектыўнасць».

### Самы дарагі ў свеце ўчастак зямлі прададзены ў Ганконгу за $3 млрд

За права набыць участак змагаліся дзевяць дэвелоперскіх кампаній, у тым ліку дзве з мацерыковага Кітая. Пераможцам таргоў стаў ганконгскі гігант у сферы нерухомасці Henderson Land, які пагадзіўся заплаціць за кожны квадратны фут (0,09 кв. м) зямлі рэкордныя $6460. Кампанія мае намер да 2022 года пабудаваць тут вышынныя офісны будынак. Ганконгскі рынак камерцыйнай нерухомасці лічыцца самым дарагім у свеце. Насамрэч, астранамічныя цэны на жыллё, офісныя і гандлёвыя памяшканні рэйлтары тлумачаць недахопам свабоднай зямлі і прапановай на рынку пры высокім попыце.

### Японская прынцэса выйдзе замуж за прасталюдзіна і адрачэцца ад тытула



Прынцэса Мака Акісіна, першая ўнучка імператара Японіі Акіхіта, скончыла Міжнародны хрысціянскі ўніверсітэт у Токіа, як і яе 25-гадовы выбраннік Кей Камура. Прынцэса ўжо пазнаёміла каханага са сваёй сям'ёй, якая ўхваліла выбар дзяўчыны. Камура працуе ў юрыдычнай фірме, захапляецца лыжным спортам і кулінарыяй, грае на скрыпцы. Прынцэса Мака атрымала адукацыю і ва ўніверсітэцкім каледжы Дубліна, Эдынбургскім універсітэце. Дзяўчына працуе навуковым супрацоўнікам філіяла музея Такійскага ўніверсітэта і атрымлівае доктарскую ступень па культуралогіі.

# Гісторыя, духоўнасць, кніга

**Свята пісьменства распачнецца мастацка-гістарычным дзействам «Беларускі шлях».**


Фота БЕЛТА.

Яно стане часткай урачыстага адкрыцця і пройдзе пад знакам дзвюх важных дат — 1155-годдзя Полацка і 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Пра гэта ішла гаворка падчас пасяджэння Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні свята, якое днямі прайшло ў Полацку пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Васіля Жарко, піша БЕЛТА. Таксама ў абмеркаванні важных пытанняў падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства ўзялі ўдзел міністры інфармацыі і культуры, прадстаўнікі іншых зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў.

Свята беларускага пісьменства, якое сёлета пройдзе ў самым старажытным горадзе Беларусі, стане сапраўды важнай падзеяй культурнага жыцця ўсёй краіны. Так, плануецца, што асвятляць яго будуць больш як сто журналістаў айчынных і замежных СМІ. Сама праграма святкавання лагічна аб'ядноўвае расказы пра нашу культуру, гісторыю, літаратуру, выдатных землякоў. Пройдзе фэст сярэднявечнай культуры «Рубон», запланаваны ўжо традыцыйны круглы стол літаратараў, у якім прымуць удзел прадстаўнікі 15 краін свету. Адбудзецца фінал конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», фінальныя мерапрыемствы навукова-асветнай экспедыцыі «Дарога да святыняў». Адной з галоўных пляцовак стане Музей беларускага кнігадрукавання, тут пройдзе адразу некалькі выстаў: будуць прадстаўлены манеты ад Нацыянальнага банка, Псалтыры з усёй Беларусі, старадрукаваныя выданні.

— Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці, адзін з найбуйнейшых культурных цэнтраў, гэты горад сімвалізуе беларускую духоўнасць, — заўважыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Сучасная Беларусь — міралюбівая, дружалюбная, адкрытая свету краіна, якая ў наш няпросты час імкнецца захаваць сябе. Беларускі шлях — гэта шлях да ўзаемапавагі і ўзаемаразумення, шлях да згоды і міру, сацыяльнай справядлівасці і духоўнага развіцця чалавека.

Важнай пляцоўкай Дня беларускага пісьменства стане старажытны Сафійскі сабор, тут будуць праходзіць канцэрты. Таксама плануецца прэзентацыя выстаўкі-пленэру «Полацк у гравюрах сучасных мастакоў».

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# ...Інвестары выбіраюць Беларусь

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Завод — рэзідэнт Свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск». Ён размясціўся ў памяшканнях буйнога прадпрыемства, плошчы якога доўгі час не выкарыстоўваліся. Такім чынам, маёмасць цяпер задзейнічана і прыносіць карысць.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ,** вітаючы ўдзельнікаў бізнес-форуму, падкрэсліў, што інвестары не пашкадуюць, што ўклалі грошы ў гэты рэгіён. Мясцовыя ўлады гатовы забяспечыць узаемадзеянне з рэспубліканскімі органамі ўлады. Падтрымка гарантуецца не толькі на этапе будаўніцтва, але і пры далейшай эксплуатацыі прадпрыемстваў, аздараўленчых комплексаў, аб'ектаў сэрвісу і паслуг. У аснове трываласці ўкладанняў — працавітасць, добрасумленнасць беларусаў. Мы — надзейныя партнёры.


Прадпрыемства па вытворчасці гіперпрасаванай цэглы і пліткі ў пасёлку Руба Віцебскай вобласці стала вынікам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, у якім удзельнічаў замежны інвестар і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі. Аб'ём інвестыцый склаў больш за 5 млн долараў.

## Арыентацыя на інавацыю

Толькі Modern-Expo інвеставала ў Віцебшчыну парадку 8 мільёнаў долараў. А ўсяго на сёння ў Прыдзвінскім краі рэалізуецца больш за 180 інвестыцыйных дагавораў на суму каля 1,2 мільярда ўмоўных адзінак. У прыватнасці, чэхі зацікавіліся перапрацоўкай торфу. Літоўцы, славакі і індыйцы арганізавалі вытворчасць лекавых сродкаў.

Мясцовая ўлада прапануе інвестарам для будаўніцтва велізарную колькасць зямельных участкаў. Ёсць магчымасць па сімвалічнай цане набыць будынкі. Многае робіцца, каб паэтапна суправаджаць кожны праект. Аблвыканкам абяцае ўзаемадзеянне з усімі службамі для мінімізацыі камерцыйный рызыкі і садзейнічанне ў вырашэнні пытанняў, звязаных з будаўніцтвам. Рэгіянальныя ўлады арыентуюць прадпрыемствы на інавацыйны шлях развіцця, пошук сучасных тэхналагічных рашэнняў.

Вытворцам Віцебшчыны таксама ёсць што прапанаваць інвестарам. На прадпрыемстве «Віцязь» засвоілі выраб зарадных станцый для электрааўтамабіляў. **Намеснік галоўнага канструктара Дзмітрый ХАРЫН** запэўніў, што аналагаў у Беларусі пакуль не вырабляе ніхто. Каля «Віцязя» ўжо можна запраўляць кілаватамі «колы». Кошт устаноўкі значна ніжэйшы, чым у замежных канкурэнтаў. Цяпер неабходна знайсці аператара — па аналогіі з кампаніямі мабільнай сувязі. Такі партнёр павінен спланаваць, дзе неабходна ўсталяваць станцыі, зрабіць гэта і эксплуатаваць іх. І хоць у Беларусі экалагічных аўто пакуль мала, за імі — будучыня. У планах «Віцязя» — экспарт станцый у Расію і іншыя краіны.


Фота Надзеі БУЖАН.

На форуме была прадстаўлена распрацоўка інжынераў кампаніі «Віцязь» — зарадная станцыя для электрамабіляў, якая выпускаецца серыйна.

Сёлета на форуме ўпершыню былі прэзентаваныя сельскагаспадарчыя холдынгі Віцебшчыны. Гэтыя інтэграваныя структуры працуюць па схеме «ад поля да прылаўка». Яны прыцягнулі інвестараў з Кітая, якія гатовы прафінансаваць будаўніцтва малочнатаварных фермаў. Бізнесмены са Славакіі зацікавіліся стварэннем фермаў па вырошчванні кароў мясных парод і комплексаў авечкагадоўлі.

## Ваду зямля падагравае

Таксама падчас эканамічнага форуму першы раз аднachасова праводзіўся XIV Рэспубліканскі экалагічны форум. На ім былі прадстаўленыя айчынныя дасягненні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. У прыватнасці, тэхналогія па выкарыстанні падземных геатэрмальных крыніц для ацяплення будынкаў. Такія ўстаноўкі ўжо функцыянуюць на памежных пераходах, у Брэсце — на прадпрыемстве па перапрацоўцы агародніны. Набыўшы абсталяванне за 20 тысяч долараў, можна дзясяткі гадоў не плаціць за электраэнергію, падагрэў вады. А ў спякоту сістэма працуе як кандыцыянер.

Зацікаўленым расказалі і пра ўчасткі для здабычы мінеральнай вады і разліву яе на продаж. Там можна пабудаваць спа-цэнтры і санаторыі.

Удзельнікам форуму паказалі, як будуецца Віцебская гідраэлектрастанцыя, самая магутная сярод аналагаў. Вялікі інтарэс выклікалі праекты па выкарыстанні адходаў абутковай і іншай вытворчасці. Далёка за межамі краіны высока цэняць беларускае адзенне, бялізну з натуральных тканін, асабліва з лёну. Таму іх вытворчасць і экспарт вельмі выгадныя. Інвестараў таксама цікавіць магчымасць перапрацоўкі беларускія карысныя травы, ягады, грыбы...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ На слыху

# ЛІШНЯЯ ГАДЗІНА: РАДАСЦЬ ЦІ ГАЛАЎНЫ БОЛЬ?

**Калі павінны распачынацца заняткі ў школах: у 8 ці 9 гадзін раніцы? Гэта пытанне сёння ва ўсіх на слыху. Прычым меркаванні і бацькоў, і саміх школьнікаў наконт гэтага падзяліліся. Бацькоў малодшых школьнікаў хвалюе найперш адсутнасць магчымасці асабіста адвесці дзіця ў школу, калі пачатак заняткаў будзе перанесены на 9 гадзін. Не моцна ўзрадаваліся і старшакласнікі, якім збіраюцца падарыць лішнюю гадзіну сну. Многія з іх займаюцца ў другой палове дня з рэпетытарамі і вяртаюцца дадому даволі позна. Пры гэтым ім яшчэ трэба падрыхтавацца да ўрокаў на заўтра. Бацькі школьнікаў, якія вучацца ў другую змену, увогуле ў роспачы...**

— Адміністрацыі школ, дзе дзеці вучацца ў дзве змены, будуць самі прымаць рашэнне аб пачатку заняткаў — аб 8.30, аб 9.00, але ў школу можна будзе прыводзіць дзяцей да 8-й раніцы, — заспакойвае ўсхваляваных бацькоў **прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Людміла ВЫСОЦКАЯ.** — Гадзіну да заняткаў дзеці будуць пад наглядам, з імі будуць займацца педагогі — фізічнай размінкай ці творчымі практыкаваннямі.

Статыстыка сведчыць, што прыкладна ў трэцяй часткі агульных сярэдніх навучальных устаноў краіны заняткі пачынаюцца а 8-й гадзіне раніцы, яшчэ столькі ж устаноў пачынаюць урокі ў 8.30 і каля 30% — а 9-й гадзіне. Графік пачатку ўрокаў рэгулюецца санітарнымі нормамі і правіламі. Там прапісана, што заняткі не павінны распачынацца раней за 8 гадзін раніцы і заканчваецца пазней за 20:00. Але 9 гадзін, на думку санітарных урачоў, больш удалы час для пачатку ўрокаў.

Па словах Людмілы Высоцкай, адміністрацыі школ, дзе дзеці вучацца ў адну змену, разглядаюць магчымасць пачатку заняткаў з 9 гадзін. Школам, якія працуюць у дзве змены, будзе больш праблематычна перабудавацца, таму што зацікавіць вучэбны працэс, і там разглядаюць магчымасць пачатку ўрокаў або ў 8.30, або ў 9.00. Пакуль міністэрства праводзіць маніторынг сітуацыі, вывучае меркаванні бацькоў, настаўнікаў, адміністрацый школ.

А як у іншых краінах? У Расіі і Украіне час пачатку ўрокаў у школе — у 8 гадзін. Аднак, як і ў нас, з улікам абставінаў ён можа змяняцца. У Польшчы, Літве, Латвіі вучоба таксама пачынаецца з усё пачынаецца ў 8 гадзін. У некаторых школах Кітая ўрокі пачынаюцца ў 7.30, у Японіі — у 8.45, у ЗША — паміж 8 і 9 гадзінамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Здарэнні

# ТРЫ ДНІ Ў ЛЕСЕ

**Хоцімскія міліцыянеры знайшлі 87-гадовую бабулю, што заблукала ў лесе, жывой і здаровай**

— Дачка пенсіянеркі, якая патэлефанавала ў Хоцімскі РАУС, была ў разгубленасці. Яе маці ніколі вось так не сыходзіла з дому, — расказвае падрабязнасці гісторыі **афіцыйны прадстаўнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір СІНКЕВІЧ.** — Да вышуку, акрамя Хоцімскага аддзела ўнутраных спраў, падключыліся супрацоўнікі ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Магілёўскага аблвыканкама, Клімавіцкага аддзялення Дэпартамента аховы МУС і ратавальнікі. Апытанне жыхароў вёскі ніякай карыснай інфармацыі не дало, а службова-вышуковы сабака ўзяць след не змог. Халоднае надвор'е, складаны ландшафт мясцовасці і багатая расліннасць таксама былі супраць нас.


Першы намеснік начальніка Хоцімскага РАУС маёр міліцыі Дзмітрый СЁМАЧКІН і зніклая Настасся ПІЎЧАНКА.

І толькі 11 мая, пасля двух дзён беспаспяховых пошукаў, група пад кіраўніцтвам першага намесніка начальніка Хоцімскага РАУС Дзмітрыя Сёмачкіна, нарэшце, знайшла зніклую. Старая ляжала пад кустамі. На пытанне Дзмітрыя Мікалаевіча, ці жывая яна, жанчына нечакана спыталася: «Ой, хлопчыкі, а колькі зараз часу?» Пенсіянерку аператыўна даставілі ў Хоцімскую раённую бальніцу, адкуль пасля поўнага абследавання адпусцілі дадому. Неверагодна, але трое сутак на холадзе без ежы і вады не нанеслі значнай шкоды здароўю Настассі Якімаўны. Вось толькі адказаць, куды і навошта яна адправілася, бабулька так і не змагла.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

Як і раней па суботах, на сувязі з насельніцтвам — Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты. Час працы застаецца нязменным — звярнуцца з просьбай або прапановай наўпрост да прадстаўніка ўлады можна з 9 гадзін раніцы і да поўдня. Прамыя тэлефонныя лініі ў краіне сталі рэгулярнымі ў пачатку 2015 года. З таго часу магчымасцю вырашыць праблемныя пытанні аператыўна і без залішняй папяровай цяганіны скарысталіся многія беларусы.

**20 мая на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Віталевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алёйзавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васілевіч (80172224444).

# «ЗАКЛАДКУ» РАБІЛА 15-ГАДОВАЯ ШКОЛЬНІЦА

**У двары жылога дома па сталічнай вуліцы Лабанка ў момант ажыццяўлення «закладкі» была затрымана 15-гадовая вучаніца адной са сталічных сярэдніх школ.**

— У ходзе правядзення надгляду пры сабе ў яе было знойдзена і канфіскавана 14 скруткаў з парашком белага колеру, які, згодна з заключэннем эксперта, з'яўляецца асабліва небяспечным псіхатропным рэчывам альфа-PVP. У чатырох схованках таксама было выяўлена і канфіскавана дадзенае псіхатропнае рэчыва, — расказала афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна Абозная. — Затрыманая з'яўляецца вучаніцай 9 класа адной са сталічных сярэдніх школ. Раней да крымінальнай адказнасці яна не прыцягвалася, аднак затрымлівалася за распіццё піва ў грамадскіх месцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# З РОДУ АМЕЛЬЯНЮКОЎ

## Рэдакцыю шукалі разведчыкі

Уладзімір Амельянюк — легенда беларускай журналістыкі. Стварыць газету ў мірны час — справа складаная і надзвычай адказная, а тут вайна, вакол — ворагі і здраднікі. Але ўсё ж, 18 мая 1942 года, у занятым фашыстамі Мінску, «Звязда» аднавіла сваю дзейнасць.

Дзякуючы найперш Уладзіміру Сцяпанавічу газета заклікала народ змагацца з ворагам, выкрывала хлуслівую палітыку акупантаў. Як бы ні хацелі апошнія, спыніць журналісцкае слова ім не ўдалося — тыраж у дзве тысячы экзэмпляраў разышоўся па горадзе і прылеглых да сталіцы вёсках. Газета дайшла да Баранавіч, Оршы, Бабруйска, Гомеля, яе чыталі ў партызанскіх атрадах.

Трапіла яна і ў рукі да ворагаў. Для пошуку падпольнай друкарні з Берліна выклікалі вопытных разведчыкаў. Гітлераўцы ведалі: пагібель самай вядомай і аўтарытэтнай беларускай газеты — органа Мінскага гаркама КП(б)Б — нанясе непапраўны ўрон падпольнаму руху. Толькі рэдакцыю яны так і не знайшлі (а між тым, першы нумар «Звязды» таемна набіраўся ў нямецкай друкарні!). Затое высачылі таго, дзякуючы каму газета разляцелася па Беларусі, — 26 мая 1942 года Уладзіміра Амельянюка застрэлілі ля Чырвонага касцёла...

## Маці Героя

Праз 20 гадоў пасля Перамогі адважны падпольшчык і таленавіты журналіст пасмяротна стаў Героем Савецкага Саюза — падобных прыкладаў за гады Вялікай Айчыннай у гісторыі СССР не было.

Толькі парадавацца высокай узнагародзе асабліва не было каму: бацьку Амельянюка забілі акупанты, сястра трапіла пад бамбёжку на пачатку вайны, лёс жонкі з сынам доўгі час быў невядомы. Маці Уладзіміра Амельянюка не стала ў 1945-м, праз некалькі дзён пасля Перамогі, — жаночае сэрца не вытрымала пакут, якія прынесла іх сям'і вайна.

Аб тым, што Паўліна Амельянюк не дажыла да таго моманту, калі яе сын стаў Героем, аўтару гэтых радкоў стала вядома дзякуючы аднаму цікаваму дакументу, знойдзенаму ў Нацыянальным архіве Беларусі. У сваіх успамінах Паўліну Сцяпанаўну згадвае падпольшчыца Марыя Рынкевіч, якая ўдзельнічала ў выданні падпольнай «Звязды».

*«Ёй было 60 гадоў,* — сведчыць падпольшчыца. — *Вайна нанесла шмат гора: разбіла вялікую дружную сям'ю (загінулі муж, сын, дачка, унукі). Акупанты з кулямёта абстралялі іх хату. Яна бачыла спалены горад, шыбеніцы, слёзы мацярок. Але гэта не зламала маці, жанчыну, чалавека. Для ўвекавечвання яе светлай памяці прапаную добраўпарадкаваць яе магільны пагорак (яна пахавана на могілках па Даўгабродскай)».*

Доўга думаць, пра якія могілкі ідзе размова, не прыйшлося. На сучаснай Даўгабродскай пахаванняў няма. Бліжэйшыя могілкі — Вайсковыя. Тым больш, што ў гады вайны там хавалі, ды і пасля Перамогі тут знаходзілі апошні прытулак.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адшукаць магілу чалавека, усіх сваякоў якога, па ранейшых перакананнях, забрала вайна, было рэдкай удачай. Яшчэ большай нечаканасцю — убачыць пахаванне добраўпарадкаваным. Тое, што прыстойнае месца спачыну «дарагой маці і бабулі» забяспечылі «дзеці і ўнукі», як напісана на пастаменце, мяне ўвогуле ашаламіла — кагосьці з Амельянюкоў вайна пакінула жывымі?



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У сямейным фотаальбоме — эксклюзіўныя кадры знакамітага дзядзькі.

## «Дзеці мае — украінцы, але Валодзю мы называлі «пскавар»

Неўзабаве здагадкі пацвердзіліся. На пажаўцелых ад часу аркушах, знойдзеных у архіве, дробнымі літарамі, выведзенымі ад рукі, чытаю ўспаміны Паўліны Амельянюк, якімі яна паспела падзяліцца незадоўга да сваёй смерці. Дакумент сведчыць: Паўліна Сцяпанаўна, па нацыянальнасці ўкраінка, нарадзілася ў былой Беластоцкай вобласці. Там жа і выйшла замуж за ўкраінца — Сцяпана Кандратавіча, які займаўся рэвалюцыйнай дзейнасцю.

*«Калі пачалася імперыялістычная вайна, я бегла з дзецьмі (у мяне быў хлопчык і дзяўчынка) да Ваўкавыска,* — успамінае Паўліна Амельянюк. — *Потым усёй сям'ёй, разам з мужам, беглі ў Пскоўскую губерню. На станцыі Дно яму ўдалося ўладкавацца пісарам у ваеннай хлебапякарні. Там былі да 1917 года. На станцыі Дно нарадзілася ў мяне трэцяе дзіця, той самы Валодзечка, які цяпер загінуў...»*

Зноў у Беларусь сям'ю Амельянюкоў прывяла служба бацькі: спачатку ён працаваў ваенным камісарам у Оршы, з 1922 па 1932 гады быў аб'ездчыкам мінскага лясніцтва, а потым яны пераехалі ў Дзяржынскае лясное ўпраўленне, дзе жылі да вайны.

*«Старэйшы сын мой працаваў землямерам у Беразіне, скончыў землеўпарадкавальны тэхнікум у Магілёве, потым быў у арміі па прызыве, пасля працаваў наркамам саўгаса,* — працягвае жанчына. — *У яго свая сям'я. З першых дзён сышоў у армію, нічога пра яго больш не ведаем. Ёсць чуткі, што быццам бы ў палоне. Дачка мая выйшла замуж за капітана, мела дваіх дзяцей. Яны жылі за Беластокам, на пагранзаставе. Што з імі — невядома. Сынок малодшы, Валодзя, вучыўся ў КІЖы. Дзеці мае — украінцы, але Валодзю мы называлі «пскавар».*



Брат Героя Савецкага Саюза Мікалай АМЕЛЬЯНЮК на працягу доўгага часу беражліва захоўваў памяць сваёй сям'і.

Вядома, што вайна Уладзіміра Амельянюка застала ў Беластоку, дзе трэцякурснік праходзіў практыку. 26 чэрвеня 1941 года, паранены ў галаву, ён вярнуўся ў Мінск. І як сведчыць маці, *«з першых дзён пачаў дапамагаць палонным пераадзявацца, каб бегчы, потым знайшоў таварышаў. Валодзя казаў, каб я нічога не казала бацьку, але ён усё ведаў. Ды і як не ведаць. З месяц у нас ляжаў хворы радыст, таксама звалі Валодзем. Мы яго выдавалі за брата нявесткі. Потым адправілі ў атрад да партызанаў. Яшчэ пры немцах ён перадаваў прывітанне. Бег з палону і хаваўся ў нас капітан Сяргей. Ён меў ордэн за Іспанію. Потым яго арыштавалі: відавочна, здаўся. Два разы ён прыходзіў да бацькі. З гестапаўцам. «Не хавай сына, усё роўна прапала, бальшавікі больш не вернуцца,* — сказаў мужу ён. — *Перадай сыну, няхай працуе на карысць гестапа...»*

## «Валодзя быў маленькім, але ўжо тады яго адрознівала жаданне ўсё давесці да канца...»

Сёння гэтая жанчына, якой мы ўдзячны за сына-героя, спачывае ў прыгожым месцы, каля царквы. Нягледзячы на такую колькасць страт, за яе душу ёсць каму маліцца. Магілу сваёй бабулі, якую ніколі не бачыла, даглядае пляменніца легендарнага журналіста Надзея Амельянюк, дачка Валодзевага брата. Запіску з просьбай адгукнуцца жанчына знайшла побач з помнікам, калі чарговы раз прыехала да пахавання. Неўзабаве ў рэдакцыі прагучаў доўгачаканы званок. І вось я ў мінскай кватэры Надзеі Мікалаеўны разглядаю сямейны альбом з фотаздымкамі і прагна лаўлю кожнае слова.



Калі Уладзімір АМЕЛЬЯНЮК працаваў піянерважатым у Дзяржынскай сярэдняй школе, сярод яго выхаванцаў быў сын старшыні Камуністычнай партыі Іспаніі Далорэс Ібаруры Рубэн, які, як і яго настаўнік, пасмяротна стаў Героем Савецкага Саюза.

— Бабулю хавала нявестка, мая маці, — пачынае аповед Надзея Амельянюк (пасля замужжа яна вырашыла не мяняць свайго прозвішча). — Бацька, яе сын, яшчэ не вярнуўся з вайны: доўгі час знаходзіўся ў нямецкім палоне. Паўліна Сцяпанаўна памерла 24 мая 1945 года на вуліцы ад разрыву сэрца. Цяпер гэта называюць інфарктам... Я вельмі мала пра яе ведаю. Ведаю толькі, што ўдзельнічала ва ўсялякіх гуртках. Яны з дзядулем былі вельмі прагрэсіўнымі: захоўвалі партыйную літаратуру, у іх на кватэры збіраліся актывісты. У такім духу і выхоўвалі дзяцей.

Іх было трое: Коля, Зіна і Валодзя. Мікалай Амельянюк быў старэйшы за свайго знакамітага брата на пяць гадоў. «Бацька казаў, што Валодзя нарадзіўся ў канцы года: ці то ў лістападзе, ці то ў снежні, — кажа пляменніца Героя Савецкага Саюза. — Ён дакладна помніў, што было холадна і нават ляжаў снег. Адкуль узялася дата нараджэння 20 мая, не ведаю».

Па родзе сваёй дзейнасці глава сям'і часта пераязджаў, таму дзе толькі Амельянюкі ні жылі. Вось што пісаў пра гэта Мікалай Амельянюк: *«У 1918 годзе бацька ўступіў у партыю. З таго часу пачалася яго служба ў Чырвонай Арміі на шматлікіх франтах грамадзянскай вайны. Помню бацьку ў ваеннай форме, з чырвоным бантам на грудзях і доўгай кавалерыйскай шашкай на баку. На пасадзе памочніка каменданта станцыі і ваеннага камісара ў 1919 годзе ён змагаўся супраць Юдзеніча і Балаховіча каля Пскова, у 1920—1921-м — супраць белапалякаў каля Барысава і Оршы, супраць Урангеля — каля Джанкоя і Керчы. І ўся сям'я, не адстаючы ад бацькі, калясіла па прасторах Расіі. У 1921 годзе бацьку назначылі камендантам станцыі Брэст, але па дарозе ў Мінск ён сур'ёзна захварэў і вымушаны быў дэмабілізавацца з арміі. Для аднаўлення здароўя яго адправілі на работу лясным аб'ездчыкам спачатку ў вёску Кайкова, каля станцыі Міханавічы, а пазней — у Каралёўскае лясніцтва, што за 40 кіламетраў ад Мінска. Маці, непісьменная жанчына, навучылася чытаць і пісаць, і падчас вандравання сям'і па дарогах грамадзянскай вайны яна, як ніхто, здолела выхаваць нас у любові да Радзімы. У рэдкія вольныя хвіліны яна любіла чытаць Пушкіна, Гогаля, Лермантава, і ў лясным доміку, дзе мы жылі, з цягам часу з'явілася невялікая бібліятэка, якой карысталіся і дзеці з суседніх вёсак. У 1924 годзе пасля смерці Леніна мы ў сябе дома арганізавалі ленінскі куток, дзе былі сабраны партрэты правадыра, кнігі і брашуры пра яго, разам з іншымі дзецьмі развучвалі вершы, прысвечаныя Уладзіміру Ільічу, спрабавалі выпускаць насценгазету. Валодзя быў зусім маленькі, але прымаў самы жывы ўдзел. Ужо тады ён вылучаўся дапытлівасцю, настойлівасцю і жаданнем усё давесці да канца...»*



Уладзімір АМЕЛЬЯНЮК (злева) і Генадзь БУДАЙ не толькі разам вучыліся ў КІЖы, але побач былі і ў падполлі. Фотаздымак зроблены падчас сумеснай работы ў рэдакцыі газеты «Ударнік Дзяржыншчыны», 1936 год.

## «Магілы дзядзька не мае...»

У паведамленні аб гібелі сына, якое атрымала Паўліна Сцяпанаўна ад Беларускага штаба партызанскага руху, датай смерці Уладзіміра Амельянюка значыцца 30 мая 1942 года. Паводле той жа крыніцы, бацька героя быў забіты раней — 9 мая.

— Наколькі я ведаю з сямейных размоў, дзядулю замучылі ў Трасцянцы, — расказвае Надзея Мікалаеўна. — Бабуля неаднойчы называла прозвішча здрадніка (сёння наўрад ці ўспомніш), але дакладна ён быў не адзін...

Аптэка непадалёк ад Чырвонага касцёла, каля якой забілі Уладзіміра Амельянюка, працяглы час з'яўлялася для падпольшчыкаў месцам перамоў. Вось і тады там была прызначана яўка...

— Яго цела ляжала каля аптэкі не адзін дзень, — удакладняе пляменніца падпольшчыка. — Бабуля бачыла гэта, але нічога зрабіць не магла. Магілы дзядзька не мае...

Няма яе і ў яго роднай сястры. Па дарозе ў эвакуацыю ў машыну, у якой ехала Зіна Амельянюк, трапіла бомба... Загінула разам з двума дзецьмі. Яе муж, ваеннаслужачы, з вайны не вярнуўся...

— А як склаўся лёс у жонкі і сына Уладзіміра Амельянюка? — гэтае пытанне не дае спакою не аднаму пакаленню «звяздоўцаў».

— Разам з маёй мамай Ліда ехала ў эвакуацыю. Іх дзеці, мой родны брат Сярожа і Гена Амельянюк, памерлі па дарозе. Пасля вайны Ліда выйшла замуж, жыла ў Маскве. Ад другога шлюбу нарадзіла сына. Памятаю, як аднойчы яна прыязджала да нас у вёску. Пакуль была жывая, падтрымлівала стасункі з маёй мамай.

## Памяць любіць цішыню

Для Мікалая Амельянюка, першынца Сцяпана Кандратавіча і Паўліны Сцяпанаўны, вайна пачалася ў 1941-м. Каля Оршы часць, у якой ён служыў, трапіла ў акружэнне. Доўгія тры гады ён знаходзіўся ў палоне, за гэты час змяніў не адзін канцлагер, але выжыў. Пасля вызвалення саюзнікамі трапіў у амерыканскую дывізію, у складзе якой і заканчваў вайну. Дамоў вярнуўся ў 1946-м: на Радзіме яго чакаў лёс ворага народа.

Але горшым для Мікалая Амельянюка было іншае — у паўпустой хаце яго чакалі толькі жонка і старэйшы сын... Тут, на Чарнышэўскага, 11, дзе збіраліся падпольшчыкі, яны і жылі па першым часе. «Я памятаю гэты дом, — успамінае Надзея Амельянюк. — Ужо там не жылі, а мама ўсё вадзіла паказваць. Бацькі пажаніліся ў 1935-м. Да вайны жылі з бабуляй і дзядулем, да Паўліны Сцяпанаўны маці прыехала і тады, калі вярнулася з эвакуацыі. У бацькі таксама была бронь, але ён пайшоў у армію...»

Удзельнікам Вялікай Айчыннай Мікалая Амельянюка прызналі амаль напрыканцы жыцця. Ён яшчэ паспеў расказаць пра сваю вайну, пра лёс знакамітага брата: выступаў у дружынах імя Уладзіміра Амельянюка, быў частым госцем у Дзяржынскай школе №2, дзе будучы герой працаваў піянерважатым, запрашалі яго і ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта туды, не задумваючыся, брат падпольшчыка аддаў і Зорку Героя, прысвоеную пасмяротна Уладзіміру Амельянюку да 20-годдзя Перамогі.

Мікалай Амельянюк пайшоў з жыцця ў 1988 годзе. Яго жонкі, Любові Антонаўны, якая ведала пра лёс гэтай гераічнай сям'і больш чым хто, не стала ўсяго некалькі гадоў таму. Яны сціпла дажывалі свой век у Мінску, ніколі не прыкрываліся подзвігамі сваіх блізкіх — лічылі, што памяць любіць цішыню.

Менавіта таму «звяздоўцы» доўгі час не ведалі пра іх існаванне, хоць Мікалай Амельянюк і быў пастаянным нашым падпісчыкам, аб чым сведчаць пажаўцелыя газетныя старонкі, датаваныя 1960-мі, 1970-мі і 1980-мі гадамі мінулага стагоддзя, якія захоўвае сёння яго дачка. Магчыма, так было б і далей — мы ніколі і не даведаліся б, што род Амельянюкоў, нягледзячы ні на што, працягваецца. Але лёс вырашыў інакш...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 МАЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№10 (15817)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны



## Алёна ВАРОНА:
# «Змяняючы свет, пачынай з сябе»

**Быць жаноцкай знешне, а ў душы — рокершай-бунтаркай. З'яўляцца адначасова стылістам, швачкай, спявачкай і рэжысёрам. Адной выхоўваць сына і выступаць у якасці лідара гурта, у складзе якога — тры хлопцы. Не разгубіцца, не апусціць рукі, калі з каманды сыходзяць музыканты, а ты застаешся сам-насам са сваімі песнямі. Усе гэтыя парадоксы існавання жанчыны на рок-сцэне выдатна ведае Алёна ВАРОНА, лідарка гурта «Варона». Не так даўно каманда прадставіла новы міні-альбом і праз тыдзень рыхтуецца прэзентаваць кліп. Пра важнасць быць цвёрдай з паплечнікамі, уменні скарыстоўваць цяжкасці дзеля развіцця і сэнс тэксту як аснову для музыкі — наша гутарка з Алёнай Варонай.**

***— Дэвіз гурта — «рок, які натхняе станавіцца лепшым». Але ж у грамадскай свядомасці рок-музыка пераважна асацыіруецца з кепскімі якасцямі, шкоднымі звычкамі. Сваёй музыкай вы імкняцеся даказаць, што такое меркаванне — памылковае?***

— У самым пачатку свайго творчага шляху я грала кепскую музыку, часам не трапляла ў ноты. Выходзіла на сцэну толькі дзеля задавальнення. Але з цягам часу людзі змяняюцца, таму паступова нашы песні і тэксты напоўніліся глыбокім сэнсам. А слоган, які ты згадала, насамрэч з'явіўся нядаўна і суадносіцца, найперш, з новым міні-альбомам «Пачні з сябе». Імкнёмся спяваць для таго, каб людзі, якія нас слухаюць, нешта зразумелі, знайшлі. Магчыма, пасля канцэрта нехта задумаецца і насамрэч стане лепшым для сябе. А ўжо потым — для іншых. Гэта ў сваю чаргу можа змяніць свет. Сваім прыкладам — не так даўно я кінула курыць — паказваю, што можна быць іншай. У нейкім сэнсе сама перарадзілася разам са сваімі песнямі.

***— Тады чаму менавіта рок? Такі сэнс можна ўкладаць у музыку іншых стыляў.***

— Я вельмі люблю гэты кірунак і не бачу сябе ў іншай музыцы. Рок дае пэўную разрадку слухачам. Яны паскачуць на канцэрце — і стане лягчэй успрымаць свет. А чаму б не паскакаць пад песні з сэнсам? Гэта крута.

***— Як жанчына пачуваецца на беларускай рок-сцэне, дзе тусоўка ў асноўным мужчынская?***

— З падлеткавага ўзросту я сябе адчувала «пацанкай». Мне падабаліся матацыклы, курткі-«касухі», хацелася апранацца, як хлопец. Гэта цяпер — што бачна па фотасесіях і канцэртах — я не адмаўляюся ад сукенак, больш жаноцкіх вобразаў. Але як і тады, так і сёння, я «свой пацан» у тусоўцы. Таму што рок-н-рольная энергія ў мяне засталася. Канешне, калі ў року з'явіцца дзяўчынка ў сукеначцы, якая будзе спяваць тоненькім галаскам на фоне брутальнай музыкі, гэта будзе выглядаць ненатуральна. Няважна, у якім жанры ты працуеш, галоўнае, каб усё выглядала гарманічна.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Мары — збываюцца!

# МАСТАК З ПЛОЙКАЙ У РУКАХ,

## або Як спецназавец у цырульнікі пайшоў

**Прафесіі ўжо даўно не дзеляцца на жаночыя і мужчынскія, але, пагадзіцеся, у некаторых амплуа бачыць хлапцоў нязвыкла. Напрыклад, у якасці медыцынскай сястры, кіяскёра, візажыста... ці нават цырульніка. Так, на Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства «Беларускі майстар — 2017» сярод спецыялістаў па прычосках быў толькі адзін хлопец. Але менавіта яму дасталася перамога. Мінчанін Мікалай КАЗЛОЎ, цырульнік 4-й катэгорыі, падзяліўся, чым яго прыцягнула гэта прафесія і як ён адчувае сябе ў жаночым калектыве.**

Складана паверыць, але Мікалай узяў у рукі плойку і нажніцы для валасоў усяго год таму.

— У прафесію прыйшоў выпадкова, — прызнаецца ён. — Вучыўся ў кадэцкім корпусе, потым пайшоў служыць у 5-ю асобную брыгаду спецыяльнага прызначэння (заўсёды марыў аб элітных войсках). Калі вярнуўся дадому, спрабаваў сябе ў розных сферах. Працаваў ахоўнікам, кур'ерам у рэстаране, таксістам, клаў плітку, вырабляў кухонныя фасады... І гэта не ўвесь спіс! Мне хацелася, каб работа была ў радасць. У выніку выбіраў паміж масажыстам і цырульнікам, але, ацаніўшы ўсе плюсы і перспектывы, вырашыў паспрабаваць сябе ў ролі апошняга.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Антона СЦЕПАНІШЧАВА.

Свой выбар

# ПРАФЕСІЯ НЕ ДЛЯ КОЖНАГА,

## АБО ЦІ ТАК ПРОСТА СТАЦЬ СТУДЭНТАМ БДПУ?




Яны свой выбар зрабілі. Іх мара стаць педагогамі ўжо збылася…

**Рэктар гэтай навучальнай установы Аляксандр ЖУК упэўнены: у сёлетнюю прыёмную кампанію іх чакае прыток добра падрыхтаваных і, галоўнае, матываваных абітурыентаў, якія ўжо паспрабавалі сябе ў прафесіі і зрабілі свядомы выбар на карысць педагогікі. «Таму наша задача — не падмануць іх чаканні. Гэта будуць першакурснікі, якія ўжо ўмеюць працаваць самастойна, знаёмыя з даследчыцкай і праектнай дзейнасцю, у якіх ёсць пэўны вопыт арганізатарскай работы з малодшымі школьнікамі, таму нам трэба быць гатовымі прапанаваць будучым першакурснікам — выпускнікам педагагічных класаў — нестандартныя, інавацыйныя і інтэрактыўныя формы работы, — заявіў ён на Савеце ўніверсітэта. — Трэба шырока ўключаць іх, пачынаючы ўжо з першага года вучобы, у работу нашых студэнцкіх навуковых лабараторый, у валанцёрскую, грамадскую дзейнасць і ў дзейнасць, звязаную з арганізацыйна-кіраўніцкімі пытаннямі. Гэта наш патэнцыял».**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ПРАФЕСІЯ НЕ ДЛЯ КОЖНАГА

## Падставы для аптымізму

Менш чым праз месяц адбудзецца першы масавы выпуск з профільных педагагічных класаў. Сёння па краіне іх налічваецца ўжо 319. Яны створаны ў 253 установах агульнай сярэдняй адукацыі. Колькасць іх навучэнцаў перавышае 3,5 тысячы чалавек. Першы выпуск з 11-х класаў складзе каля 1,5 тысячы.

Рабіць аптымістычныя прагнозы кіраўніцтву БДПУ дазваляе статыстыка рэгістрацый на ЦТ: толькі ў першыя два дні з моманту адкрыцця рэгістрацыі на ЦТ у БДПУ звярнуліся 900 чалавек, якія пажадалі праходзіць экзамены менавіта ў яго сценах. Як сведчыць практыка папярэдніх гадоў, большасць з тых, хто здае ЦТ у педагагічным універсітэце, затым падаюць свае дакументы менавіта сюды.

— Педагогіка — прафесія не для кожнага, і я ўпэўнены, што настаўнік «пачынаецца» не з педуніверсітэта — «гадаваць» будучых педагогаў трэба яшчэ ў школе. Трэба шукаць дзяцей з педагагічнымі схільнасцямі, з жаданнем вучыць іншых, з лідарскімі задаткамі, з уменнем камунікаваць і выстройваць зносіны з іншымі. Матывацыя да прафесіі — гэта, напэўна, самае важнае, — лічыць Аляксандр Жук. — Менавіта з гэтай мэтай і стварыліся профільныя педагагічныя класы. За імі будучыня, гэта наш падмурак. І калі ў першы год іх дзейнасці некаторыя рэгіёны асцярожна паставіліся да нашай ідэі, то затым усе яе падтрымалі.

## Выпрабаванне на прафпрыдатнасць

Як вядома, згодна з новымі Правіламі паступлення ў ВНУ, выпускнікам профільных педагагічных класаў цяпер дадзена права паступаць на педагагічныя спецыяльнасці па выніках гутаркі.

— Ёсць меркаванне, што гэтай катэгорыі абітурыентаў прадастаўлены занадта вялікія льготы. Маўляў, у педагагічны ўніверсітэт пойдуць усе без разбору, у тым ліку і тыя, хто не можа добра здаць цэнтралізаванае тэсціраванне. Але такія разважанні і апасенні абсалютна пазбаўленыя падстаў, — упэўнены Аляксандр Жук. — Навучэнцы ў педагагічных класах і групах вывучаюць два-тры вучэбных прадметы на павышаным узроўні. Як правіла, гэта тыя прадметы, настаўнікамі якіх яны плануюць стаць у будучыні. Акрамя таго, старшакласнікі павінны абавязкова засвоіць праграму факультатыву «Увядзенне ў педагагічную прафесію» аб'ёмам 140 вучэбных гадзін за два гады. Па выніках гутаркі змогуць паступаць толькі тыя з выпускнікоў педагагічных класаў, хто мае па ўсіх прадметах у атэстаце адзнакі ад 7 да 10 балаў, а па профільных прадметах, якія вывучаюцца на павышаным узроўні, — не менш як 8 балаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК даў інтэрв'ю вучаніцы профільнага педагагічнага класа сталічнай гімназіі №20 Дар'і Ракіцкай.**

Рэктар БДПУ лічыць, што гэта дастаткова жорсткія патрабаванні, паколькі нават у найлепшых ліцэях і гімназіях толькі крыху больш за палову выпускнікоў маюць па профільных прадметах ацэнкі, вышэйшыя за 8 балаў. І, нарэшце, абітурыенты павінны падаць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю, зацверджаную педсаветам. А яна выдаецца па выніках створанага адзінаццацікласнікам уласнага партфоліа. Гэта значыць, што школа нясе поўную адказнасць за яе аб'ектыўнасць.

— Мы цудоўна разумеем, што не ўсіх школьных выдатнікаў ці «харашыстаў» можна дапускаць у школу ў якасці педагогаў, — канстатуе Аляксандр Жук. — Менавіта таму і ўзнікла неабходнасць запаўнення партфоліа. Усё ж такі прывілея паступлення без экзамену ў ВНУ павінна быць чымсьці падмацаваная. І звычайнай характарыстыкі-рэкамендацыі будзе ў гэтым выпадку недастаткова. Вельмі важнае значэнне мае паглыбленне школьніка ў педагагічную прафесію цягам двух апошніх гадоў. Наколькі ў яго гэта атрымалася, члены прыёмнай камісіі даведаюцца з партфоліа. Яно фіксуе ўсе дасягненні навучэнцаў: работу важатымі, памочнікамі класных кіраўнікоў у малодшых класах, валанцёрамі ў аздараўленчых лагерах, удзел у арганізацыі розных школьных мерапрыемстваў і гэтак далей.

## Свае сярод сваіх

Дарэчы, у пералік спецыяльнасцяў, на якія выпускнікі педагагічных класаў змогуць паступаць без экзаменаў, увайшлі 38 спецыяльнасцяў не толькі педагагічнага, але і навукова-педагагічнага профілю. У яго складанні ўдзельнічалі ўсе суб'екты вучэбна-навуковага інавацыйнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі, створанага на базе БДПУ.

Аляксандр Жук канстатуе: «Мы разумеем, што частка нашых абітурыентаў можа пайсці на навукова-педагагічныя спецыяльнасці, у першую чаргу звязаныя з матэматыкай і фізікай. Яшчэ пэўная частка зробіць выбар на карысць рэгіянальных універсітэтаў, дзе таксама рыхтуюць кадры для сістэмы адукацыі. Але тым і цікавей... Менавіта ў канкурэнтнай барацьбе праяўляюцца вынікі паспяховай дзейнасці».

Безумоўна, у выйгрышы будзе той, хто ўшчыльную працуе з патэнцыяльнымі абітурыентамі. Вучні педагагічных класаў — заўсёды чаканыя госці ў БДПУ. Яны пагружаюцца ва ўніверсітэцкае жыццё, становяцца, так бы мовіць, сваімі, прымаючы ўдзел у шматлікіх сумесных мерапрыемствах: гэта і рэспубліканская алімпіяда па педагогіцы, і педагагічныя дэбаты «Школы заўтрашняга дня», спартыўныя спаборніцтвы, навуковыя канферэнцыі, «зорныя паходы», у якіх сёлета ўпершыню разам са студэнтамі ўдзельнічалі і школьнікі.

Зусім нядаўна ў БДПУ адбыўся фінал рэспубліканскага конкурсу «Будучыя педагогі — пра школу будучыні». Ён праводзіўся ў трох намінацыях: «Навукова-даследчы праект» (навуковае паведамленне, артыкул, мадэль); «Мультымедыйны праект» (прэзентацыя, мультфільм, відэаролік, відэафільм, калаж, малюнак) і «Літаратурная творчасць» (вершы, эсэ, нарыс). Свае заяўкі на ўдзел у конкурсе падало каля 300 навучэнцаў педагагічных класаў з розных куткоў краіны. Да ўдзелу ў студэнцкай секцыі конкурсу далучыліся таксама і замежныя ўдзельнікі — студэнты-першакурснікі педагагічных спецыяльнасцяў з Беластоцкага ўніверсітэта (Рэспубліка Польшча), Будапешцкага ўніверсітэта (Венгрыя), Мардоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (г. Саранск, Расійская Федэрацыя) і Уральскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта (г. Екацярынбург, Расійская Федэрацыя).

«У творчых работах хлопцаў і дзяўчат мы ўбачылі вобраз той школы, у якой яны хацелі б працаваць педагогамі і ў якую хацелі б прывесці сваіх дзяцей», — падкрэслівае Аляксандр Жук.

## Не толькі жаночая прафесія

Дарэчы, у канцы мінулага навучальнага года БДПУ праводзіў рэспубліканскае апытанне навучэнцаў педагагічных класаў. Адказы на пытанне аб прафесійных намерах старшакласнікаў аказаліся аптымістычнымі: траціна апытаных паведамілі, што ўжо вызначыліся з выбарам педагагічнай прафесіі (34%). Але большая частка (56%) яшчэ былі ў роздуме. Праўда, і льгота для выпускнікоў педагагічных класаў была на той час толькі абяцаннем, і дзейнічалі ранейшыя Правілы прыёму. Да канца мая адзінаццакласнікам зноў прапануюць адказаць на пытанні анкеты, каб даведацца, як змянілася сітуацыя за апошні год.

Цікава, што і прычыны выбару старшакласнікамі навучання ў педагагічных класах згадваліся самыя разнастайныя. Сярод іх дамінаваў матыў, звязаны з жаданнем вывучаць пэўныя прадметы на павышаным узроўні (36%). На другім месцы — матыў, звязаны з гатоўнасцю звязаць сваё жыццё з педагагічнай прафесіяй (24%). Далей ішлі магчымасць паступіць на педагагічную спецыяльнасць без экзаменаў (20%) і рэкамендацыя бацькоў (18%).

Аляксандр Жук канстатуе: тон СМІ ў адносінах да прадстаўнікоў педагагічнай прафесіі апошнім часам прыкметна змяніўся.

— І ў грамадстве сталі часцей казаць пра высокую місію педагога, пра перавагі настаўніцкай прафесіі: яе стабільнасць і сацыяльную абароненасць, працяглы летні адпачынак, — падкрэслівае ён.

За апошнія два гады ў БДПУ якасна змяніўся склад абітурыентаў. Рэктар прывёў некалькі лічбаў: у 2013 годзе ва ўніверсітэт паступілі ўсяго 32 медалісты, у 2014 годзе — 100, 2015-м — 132, а ў 2016 годзе — ужо 170 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай.

Да таго ж вынікі апошняй прыёмнай кампаніі абвяргаюць стэрэатып пра тое, што прафесія педагога — пераважна жаночая. У БДПУ назіраецца значнае павелічэнне сярод студэнтаў юнакоў. Сярод першакурснікаў узору 2016 года амаль 30 працэнтаў хлопцаў. На гістарычным і фізіка-матэматычным факультэтах іх больш як 40 працэнтаў, а на факультэце фізічнага выхавання хлопцаў больш як 60 працэнтаў ад агульнай колькасці навабранцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

### Будзь у курсе

Гутарка праводзіцца ў вуснай форме. Заданні (пытанні) для яе правядзення складае камісія ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай факультатыўнага курса «Уводзіны ў педагагічную прафесію. X—XI класы».

Абітурыент, які праходзіць гутарку, удзельнічае ў конкурсе, які па рашэнні прыёмнай камісіі ўстановы вышэйшай адукацыі можа праводзіцца па факультэце, групе факультэтаў, спецыяльнасці, групе спецыяльнасцяў. Рашэнне аб яе праходжанні або непраходжанні прымаецца большасцю галасоў членаў камісіі. Калі абітурыент не згодны з вынікам гутаркі, ён можа падаць апеляцыю на імя старшыні камісіі ў дзень яе правядзення. Апеляцыя падлягае разгляду ў дзень яе падачы.

Калі раптам складзецца конкурсная сітуацыя, у гэтым выпадку ў Парадку прыёму агавораны парадак, якім чынам адбываецца залічэнне. Ёсць пэўны пералік, хто залічваецца ў першую чаргу, хто — у другую і гэтак далей. Логіка ўступнай кампаніі выбудаваная наступным чынам: выпускнікі педагагічных класаў, якія маюць права паступаць без экзаменаў, праходзяць гутарку ў тэрміны падачы дакументаў. І калі іх спроба раптам акажацца няўдалай, яны яшчэ паспеюць падаць свае сертыфікаты ЦТ і паступаць на агульных падставах. Правядзенне гутаркі завяршаецца не пазней чым за два дні да завяршэння тэрміну падачы дакументаў у прыёмныя камісіі для ўдзелу ў конкурсе на бюджэтныя месцы.




**Сёлета студэнты БДПУ адправіліся ў «зорны паход» ужо 52-і раз. Упершыню да іх далучыліся і навучэнцы профільных педагагічных класаў.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

# МАРАФОН У ПАДТРЫМКУ ВАСІЛЬКА

**У Міжнародны дзень сям'і Віцебская абласная арганізацыя БРСМ дала старт рэспубліканскаму этапу дабрачыннага марафону «Усе фарбы жыцця для цябе» ў падтрымку шасцігадовай Васілісы Армянінавай, у якой напярэдадні Новага года здарыўся... інсульт.**

Першы прыпынак рэспубліканскага этапу марафону сёлета — Орша. У дабрачыннае творчае падарожжа выправіліся пастаянныя валанцёры руху «Добрае Сэрца» — заслужаныя артысткі Беларусі Наталля Тамела і Вікторыя Алешка, папулярныя тэлевядучыя Вольга Плотнікава і Яўген Булка, група «PROвакацыя», Вольга Калеснікава, Надзея Місякова, Аляксандра Няхай, Эліна Матарас.

Усе атрыманыя грашовыя сродкі ад продажу білетаў на творчую праграму арганізатары мерапрыемства накіруюць на лячэнне маленькай Васілісы.

Да 13 снежня 2016 года Васілёк, як ласкава называюць яе бацькі, была стараннай вучаніцай першага класа аршанскай сярэдняй школы №19, адной з самых таленавітых, паспяховых і перспектыўных юных выхаванак студыі спартыўнага бальнага танца «СПРЭС». Бяда прыйшла нечакана. Літаральна за пару тыдняў да Новага года па незразумелых дагэтуль прычынах на фоне поўнага здароўя ў дзяўчынкі адбылося спантаннае кровазліццё ў мозг...

У цяперашні час вядзецца збор сродкаў на лячэнне і рэабілітацыю Васілісы Армянінавай. Неабходная сума — 390 тысяч рублёў (206 106 долараў).

Традыцыйна правядзенне такіх мэтавых праграм марафону прымеркавана да міжнародных альбо сусветных памятных дат. Напрыклад, у чэрвені — да Міжнароднага дня абароны дзяцей (Гомельская вобласць), у жніўні — да Міжнароднага дня моладзі (Гродзенская вобласць), у верасні — да Міжнароднага дня дабрачыннасці (Магілёўская вобласць), у кастрычніку — да Міжнароднага дня ўсмешкі (Магілёўская вобласць), у лістападзе — да Сусветнага дня дабрыні, у снежні — напярэдадні агульнарэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» (Мінск).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# МАСТАК З ПЛОЙКАЙ У РУКАХ...



Адна з аўтарскіх работ маладога цырульніка.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Наконт будучай прафесіі Мікалай раіўся з сястрой, сябрамі, баяўся, што яго не зразумеюць. Тыя спачатку думалі, што хлопец жартуе. Але намеры маладога чалавека аказаліся сур'ёзнымі. Грошай не было, таму Мікалай шукаў бясплатныя курсы з наступным уладкаваннем на работу. Адвучыўся ў сетцы цырульняў «Усход», дзе цяпер і працуе. Планаваў стаць толькі жаночым майстрам, але потым зацікавіўся і мужчынскімі стрыжкамі. На думку Мікалая, дамы — больш патрабавальныя кліенты: «Усе хочуць быць прыгожымі, каб улюбляць у сябе».

Яшчэ падчас курсаў хлопец пачаў удзельнічаць у прафесійных конкурсах. У «Ружы вятроў», напрыклад, спрабаваў свае сілы ў намінацыі «hair tattoo» (мастацкі выстрыг) — заняў 6-е месца з 15. А ўжо на «Беларускім майстры — 2017» навічка чакаў сапраўдны поспех.

— Да конкурсу мяне рыхтавала майстар Вольга Далідовіч, дзялілася сваім інструментам, бо ў мяне не было ні плойкі, ні шпілек, — з усмешкай успамінае Мікалай. — Хацелася стварыць нешта незвычайнае і цікавае. На прычоску адводзілася 40 хвілін, і ў прынцыпе, калі трэніраваўся, я ўкладваўся ў гэты час. Дарэчы, мадэллю, якая дэманстравала конкурсную работу, была мая сястра.

Малады цырульнік прызнаецца, што дагэтуль крыху бянтэжыцца, калі працуе з кліентамі. Паколькі Мікалай яшчэ мае мала вопыту, то звычайна стрыжэ так, як хоча наведвальнік. Па яго назіраннях, сярод дзяўчат цяпер папулярнае карэ з падаўжэннем да твару, а хлопцы аддаюць перавагу стрыжцы паўбокс. А вось са сваімі валасамі юнак не эксперыментаваў: хацеў паспрабаваць, але так і не адважыўся.

— На сваю прычоску я не трачу шмат часу: проста кожны дзень мыю галаву і сушу фенам. Ніякіх укладачных сродкаў. Мне здаецца, што хлопцу не варта праводзіць гадзіны каля люстэрка. Лепш патраціць гэты час на што-небудзь карыснае, напрыклад, адціканні ці падцягванні. Трэба ж быць мужным! — лічыць былы спецназавец.

У чым сакрэт прыгожых валасоў? Парады для дзяўчат ад майстра-пачаткоўца простыя: менш паліць локаны прасікамі і рабіць маскі. А калі фарбавацца, то лепш у прафесіяналаў, каб не застацца без валасоў.

Цікавімся, як яму працуецца сярод дам. «У жаночым калектыве адчуваю сябе добра. Усе дапамагаюць, калі ў мяне з'яўляюцца нейкія пытанні. Чуў, што калі цырульнік — мужчына, ды яшчэ і добры майстар, да яго выстройваецца з кліентаў чарга. Буду правяраць гэту тэорыю на практыцы», — смяецца Мікалай.

Прафесія цырульніка яму падабаецца тым, што дазваляе быць мастаком. «Тут няма абмежаванняў. Можна рабіць людзей больш шчаслівымі і яркімі! Мне вельмі падабаецца тое, чым цяпер займаюся. Вядома, гэта больш складана, чым я думаў: тут столькі нюансаў, што, здаецца, і паўжыцця не хопіць, каб з усім разабрацца. Але я ўпэўнены, што змагу справіцца».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*





# Змахнуць і закахацца?

**Не так даўно натрапіў у сеціве на дзіўны матэрыял. Сямейныя пары, чые стасункі пачаліся з інтэрнэту, расказвалі, як сустрэлі адно аднаго і наколькі яны шчаслівыя ў сваіх шлюбах. Нават рамантычныя моманты знайшліся — адна сям'я прызналася, што дагэтуль захоўвае сваю перапіску ў месенджары ICQ у раздрукаваным выглядзе. Матэрыял, безумоўна, цікавы, але ўвесь час хацелася агучыць знакамітую фразу Станіслаўскага: «Не веру!» Сам адношуся да пакалення інтэрнэту, але ўжо шмат гадоў упэўнены: знаёмствы ў сеціве практычна заўжды асуджаны на правал.**

Калі ў інтэрнэце можна замаўляць ежу, зарабляць грошы і забаўляцца, чаму б не перанесці сюды і каханне? Пэўна, прыкладна так разважалі стваральнікі аднаго з самых папулярных сэрвісаў для знаёмстваў пад назвай Tinder. Прынцып яго дзеяння (як і шматлікіх аналагаў) просты: усталёўваеце праграму на смартфон, загружаеце свае фотаздымкі і пачынаеце прагладаць фатаграфіі іншых карыстальнікаў (праграма па змоўчанні падбірае толькі людзей, што знаходзяцца ў радыусе некалькіх кіламетраў). Калі падабаецца — змахваеце фота ў правы бок, гэта «лайк», не — рухаеце пальцам улева, «дызлайк». Тут жа можна ўбачыць імя патэнцыяльнага партнёра, яго ўзрост і кароткую інфармацыю пра інтарэсы. Калі нехта з тых, каго вы ўпадабалі, адкажа ўзаемнасцю, адкрываецца чат — можна дамаўляцца пра сустрэчу.

Праграмай карысталіся дзясяткі маіх знаёмых, але пра вялікія поспехі на любоўным фронце чуць не даводзілася. Так, з новымі знаёмымі яны сустракаліся, часам нават даходзіла да некалькіх спатканняў, але ў сур'ёзныя стасункі «лайкі» ў Tinder ні ў каго не перараслі. Адна сяброўка замест накачанага прыгажуна ўбачыла не надта ахайнага і замкнёнага ў сабе маладога чалавека. Іншая расказала, што пасля шэрагу недвухсэнсоўных намёкаў ад новых знаёмцаў падчас першых жа размоў палічыла за лепшае выдаліць праграму. Дарэчы, нацяжка здагадацца, што падобныя кантакты нярэдка становяцца пачаткам небяспечных, крымінальных ці нават трагічных гісторый.

Літаральна нядаўна ў расійскім Навасібірску дзяўчына запрасіла да сябе ў госці на здымную кватэру якраз такога інтэрнэт-знаёмага. Той прыйшоў з сябрам, да самой гераіні таксама завітала прыяцелька. Але рамантычнай вячэры не атрымалася — замест кветак новыя знаёмыя прынеслі з сабой халодную зброю і пад пагрозамі вынеслі з кватэры каштоўныя рэчы. Кавалераў у хуткім часе затрымалі, аднак асадак, як той казаў, застаўся. У ЗША жыхар Канзаса шэсць дзён утрымліваў у нявoлі і збіваў дзяўчыну, з якой пазнаёміўся праз Tinder. Цяпер яму пагражае 32 гады пазбаўлення волі. Зразумела, часам здараюцца і станоўчыя сюрпрызы, як у выпадку аднаго амерыканскага хлопца, на спатканне з якім пасля знаёмства ў тым жа сэрвісе прыйшла... знакамітая актрыса. Але гэта, хутчэй, выключэнне з правілаў.

Згодны, сэрвісы накшталт Tinder могуць некаму дапамагчы ў пошуку сваёй другой палавінкі. Напрыклад, інтравертам ці людзям, якім цяжка заводзіць новыя знаёмствы ў рэальным жыцці, сапраўды можа быць прасцей пайсці на першы кантакт з упадабаным чалавекам менавіта так. Нядаўна бачыў інфармацыю, што праграмы для знаёмстваў у інтэрнэце пачалі выкарыстоўваць... кадравыя агенцтвы. Маўляў, на сайтах рэзюмэ цяжка ўбачыць, што з сябе ўяўляе патэнцыяльны супрацоўнік. А вось у прыватнай размове «інкогніта» можна высветліць усё, што трэба. У іншых выпадках — не бачу сэнсу ў тым, каб усталёўваць Tinder. Зрэшты, калі не хочаце некалі паўдзельнічаць у падобным дыялогу: «— Тата, а як ты спаткаў нашу маму? — О, сынок, гэта прыгожая гісторыя. Я змахнуў яе фотаздымак у правільны бок».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Пераемнасць традыцый*

# ЖЫВЫ ЛЕТАПІС ПІЯНЕРЫІ

## 19 мая ёй спаўняецца 95 гадоў

**Гісторыя піянерыі ў СССР пачынаецца з прыняцця рашэння Усерасійскай камсамольскай канферэнцыі 19 мая 1922 года аб стварэнні піянерскай арганізацыі. Да 1924 года яна насіла імя Спартака, а пасля смерці Уладзіміра Ільіча Леніна была названая яго імем. У наступныя гады піянерскія атрады сталі фарміравацца на базе школ паўсюдна. Ужо праз некалькі гадоў пасля пачатку руху налічвалася да паўтара мільёна піянераў. У іх, як правіла, прымаліся дзеці, пачынаючы з 9-гадовага ўзросту (звычайна ў 3—4 класах савецкай сярэдняй школы). У першую чаргу піянерамі станавіліся выдатнікі і актывісты.**

І нават цяпер, праз шмат гадоў, былыя савецкія піянеры, ужо дарослыя, памятаюць тое хваляванне, якое адчувалі пры падрыхтоўцы да ўступлення ў шэрагі масавай грамадска-палітычнай арганізацыі. Памятаюць, як пад гукі горнаў і барабанаў завязвалі ім пунсовыя гальштукі, як урачыста ў сваім жыцці ўрачыста прысягалі на вернасць піянерскай справе. У гэтым я ўпэўнілася, пагутарыўшы з піянерамі даваенных і пасляваенных гадоў — жыхаркамі вёскі Табулкі.

— У піянерскай арганізацыі я была яшчэ да вайны. Гэта была сярэдзіна 1930-х гадоў, — расказала мне Ефрасіння Іванаўна Мікалайчык. — Памятаю, ужо тады існавалі так званыя цімураўскія каманды. Мы займаліся грамадскай дапамогай, гэтак жа дапамагалі ў калгасах: палолі проса, падбіралі каласкі збожжа, знішчалі пагібельную для ўраджаю саранчу. Займаліся зборам каляровых металаў, лекавых раслін, музейных экспанатаў. Піянеры заўсёды прымалі актыўны ўдзел у школьных і грамадскіх мерапрыемствах. Да гэтага часу памятаю, якой радасцю для нас было запрашэнне ў Палац піянераў на сустрэчу з вядомай савецкай актрысай Любоўю Арловай. Выстраіўшыся вялікай калонай, мы ўрачыстым шэсцем, займаючы ледзь не ўсю вуліцу, адправіліся сустракаць зорку кіно.

Перагортваем старонкі піянерскага летапісу. Сваімі ўспамінамі са мной таксама падзялілася Марыя Сцяпанаўна Літвінчук — піянерка пасляваеннага часу.

— У кожным класе былі піянерскія звёны, куды ўваходзіла 5—8 дзяцей, якія сябравалі адно з адным, жылі ў адным доме ці на адной вуліцы. Я была звеннявой у сваім класе. У сярэдзіне 1950-х гадоў адной з асноўных задач піянерскай арганізацыі было паляпшэнне якасці навучання, авалоданне асновамі навук. Як абвяшчаў піянерскі лозунг: «Піянер — усім дзецям прыклад!» і мы стараліся выканаць гэтую задачу: навучалі непісьменных, дапамагалі адстаючым, клапаціліся аб тым, каб усе вучні хадзілі ў школу. Яшчэ ладзілі конкурсы на лепшага матэматыка, фізіка, знаходзілі розныя формы таварыскай узаемадапамогі, дамагаліся таго, каб піянеры былі перадавікамі ў вучобе, — падзялілася Марыя Сцяпанаўна. — Мы ўзмоцнена займаліся спортам, прымалі ўдзел у розных спартыўных спаборніцтвах і эстафетах. Хадзілі ў сумесныя паходы, ездзілі на экскурсіі, удзельнічалі ў ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца».

Піянеры нашага часу працягваюць і развіваюць традыцыі старэйшага пакалення. Піянерская арганізацыя ў нашай школе існуе з дня яе ўтварэння. Дружына з гонарам носіць імя нашага выпускніка, воіна-інтэрнацыяналіста Івана Бурэнкі. У скарбонцы спраў юных піянераў — працоўныя дэсанты, канцэрты для працаўнікоў вёскі, цімураўская работа. А наперадзе яшчэ мноства піянерскіх адкрыццяў, эстафет і творчых спраў.

**Ірына ЛУКАШЫК,
вучаніца 11 класа
Табульскай сярэдняй школы
Пінскага раёна.**

*Падзея*

# ЗА ПЯЦЬ КРОКАЎ ДА СТАГОДДЗЯ



**Міжнародны злёт піянераў «Заўсёды гатовы!», прысвечаны 95-годдзю піянерскага руху, пройдзе 19—20 мая ў Мінску.**

Удзел у ім возьмуць прадстаўнікі Міжнароднага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Саюз піянерскіх арганізацый — Федэрацыя дзіцячых арганізацый», піянерскіх арганізацый СНД, ветэраны піянерскага руху, фіналісты рэспубліканскіх конкурсаў і партнёры Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі.

Цэнтральнымі мерапрыемствамі злёту стануць рэспубліканскі конкурс «Суперважаты» сярод старшых важатых піянерскіх дружын, хіт-парад «Піянерская дваццатка», IV рэспубліканскі збор «Я піянер сваёй краіны!», прысвечаны дню піянерскай дружбы. У праграме злёту — міжнародная выстаўка «Піянерыя — цудоўная краіна», жывы альманах «Летапіс піянерыі». Таксама будзе працаваць піянерская гасцёўня «Літаратурны вернісаж» пры ўдзеле выдавецтва «Чатыры чвэрці» і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адбудзецца тэатралізаванае прадстаўленне «Рэспубліка тысячы зорак».

БРПА аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах больш як 650 тысяч піянераў і акцябрат і з'яўляецца адной з самых масавых дзіцячых арганізацый у Беларусі. Асноўныя напрамкі яе дзейнасці — грамадзянска-патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне, сацыяльная абарона дзяцей і падлеткаў, дабрачыннасць, развіццё спорту і турызму, абарона навакольнага асяроддзя.

«Візітнай карткай» беларускіх піянераў з'яўляюцца ваенна-патрыятычная гульня «Зарніца», агляд-конкурс піянерскіх агітбрыгад «Запалі вогнішча дабрыні», рэспубліканскія конкурсы «Піянер года», «Суперзорачка», турнір па піянерболе, гульня для акцябрат «Пароль — акцябронак», працоўная акцыя «Наша піянерская праца табе, Айчына!» Піянеры і акцябраты актыўна ўдзельнічаюць у адроджаным цімураўскім руху: праводзяцца рэспубліканскія акцыі «Ветэран жыве побач», «Ніхто не забыты», «Абеліск». Вынікам рэалізацыі праекта «Ніколі не забудзем. Унукі пра вайну» стала выданне кнігі, якая ўключае 73 творы юных аўтараў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*У краі далёкім*

# ДОСВЕД, АХІНУТЫ САКУРАЙ

**Японія — адна з тых краін, якія для большасці беларусаў застаюцца практычна недасяжнымі. Не дзіўна: супрацьлеглы бок зямнога шара, кардынальна іншая культура, высокія цэны... Нават калі нехта з турыстаў і трапляе ў «Ніпон», то надоўга звычайна там не затрымліваецца. Але малады беларускі дызайнер Раман ДАВЫДКА нядаўна не толькі наведаў Краіну ўзыходзячага сонца, але і пражыў там дзевяць месяцаў. Пра тое, чаму беларусам варта павучыцца ў японцаў і чаму вярнуўся на радзіму, хлопец расказаў «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

## Ад ролаў і мангі да білетаў на самалёт

— Маё знаёмства з японскай культурай пачалося з кухні, — усміхаецца Раман. — Гэта было яшчэ ў школе. Сябра набыў сабе ролы, а я адварочваў нос: «Як можна есці сырую рыбу?» У рэшце рэшт пакаштаваў адзін і ў выніку ўзяў вялікую порцыю. Потым пачаў глядзець анімэ (японскую анімацыю), трохі пазней зацікавіўся мангай (коміксамі ў той жа візуальнай стылістыцы). Неяк ва ўніверсітэце здарыўся доўгі перыяд хандры, я не разумеў, чаго хачу ад жыцця. Гэта заўважыў бацька, спытаў у мяне, чым бы я хацеў заняцца. Я падумаў і сказаў, што хачу з'ездзіць у Японію. Падалося, што ён адрэагаваў скептычна, але праз некалькі дзён даслаў мне спасылку на курсы японскай мовы і паабяцаў, што калі я адзаймаюся год, ён падорыць мне білеты на самалёт.

Курсы хлопца адразу захапілі. Заняткі вёў «сэнсэй» з Японіі, ды і ўвогуле вывучэнне мовы, карэнным чынам адрознай ад беларускай, аказалася цікавай справай. Праз год настаўнік звязаўся са школай у Токіа і дамовіўся аб прыездзе свайго вучня. Афарміўшы візу, хлопец упершыню накіраваўся ў Краіну ўзыходзячага сонца — на месяц. Наведваў заняткі па чатыры гадзіны на дзень, астатні час траціў на знаёмства з горадам. Калі вярнуўся ў Беларусь, зразумеў: гэтага мала. І пачаў рыхтавацца да больш працяглай паездкі.

— У фінансавым плане ўсё містычна круцілася вакол лічбы 800 долараў, — смяецца вандроўнік. — Такім быў кошт аднаго месяца заняткаў у школе (першы з іх я аплачваў загадзя), столькі ж каштавалі білеты на самалёт да Токіа і назад, такую ж суму я аддаваў у месяц за пражыванне. Увогуле, існуе тры варыянты размяшчэння. Найбольш танны — інтэрнат, яго прадастаўляе школа. «Сярэдні», якім скарыстаўся я, — так званая «хост фэмілі» (прымаючая сям'я). Многія японцы маюць уласныя прыватныя дамы ў горадзе, дзе размяшчаюць вучняў такіх школ, як мая. У нашых гаспадароў, напрыклад, каля двух дзясяткаў пакояў. У кошт пражывання ўваходзяць штодзённае харчаванне, інтэрнэт, мыццё адзення і бялізны, камунальныя паслугі і іншае. Самы дарагі варыянт — арэнда кватэры, бо цэны на жыллё ў Токіа шалёныя. За 600 долараў можна зняць аднапакаёўку без мэблі, сюды ж трэба дадаць цану залогу, «камуналкі» і іншага. Прычым варта разумець, што кватэры ў японцаў звычайна вельмі аскетычныя: з малюсенькімі пакоямі, сумешчанымі ваннай і прыбіральняй і з кухняй проста ў прыхожай.

## Пра культуру чэргаў і вячэру «з пярчынкай»

— Першае, што кідаецца ў вочы ў Японіі, — татальны клопат пра людзей, — адзначае Раман. — На мытні ў аэрапорце заўсёды будуць працаваць усе кабінкі, а консульскія, калі дыпламатаў няма, будуць прапускаць шараговых пасажыраў. Заблытацца немагчыма — скрозь стаяць спецыяльныя супрацоўнікі, якія ледзь не за руку накіроўваюць людзей у патрэбным месцы. А яшчэ ў японцаў ёсць своеасаблівая «культура чэргаў», бо стаяць у іх даводзіцца нярэдка. Напрыклад, у метро абазначаны месцы адкрыцця дзвярэй вагона, і пасажыры загадзя выстройваюцца ў шэрагі перад імі. Займаць месца за іншых не прынята, кожны новы чалавек заўсёды становіцца ў канец. Затое там ніколі не пачуеш славутага «вас тут не стаяла». А яшчэ я адзначыў бы нейкую бязмежную ветлівасць мясцовых. Скажам, пераходзіш праезную частку, і кіроўца саступае пешаходам (ён абавязаны гэта зрабіць па правілах). Але ўсе прахожыя ўдзячна схіляюць галаву — маўляў, «дзякуй!» Ці наадварот: кіроўца выпадкова стаў пасярод перахода — абавязкова будзе жэстамі ўсяляк выбачацца перад пешаходамі.

Адна з прыродных з'яў, характэрная для Японіі і якой няма ў нас, — землятрусы. Раман кажа, што толькі за час яго візіту штуршкі здараліся разоў пяць-сем. Але мясцовыя на іх звычайна практычна не рэагуюць. Калі такое адбываецца падчас вячэры, сям'я проста працягвае трапезу. Адзінае, што нехта можа жартам ацаніць магутнасць: «Балаў пяць». А вось беларускаму госцю першы раз было не да смеху, асабліва калі штуршкі не скончыліся праз некалькі імгненняў.



Традыцыйная японская страва гюдон: рыс з варанай ялавічынай, цыбуляй і сырым яйкам.

— Калі казаць пра цэны, то ўсё проста — большасць тавараў прыкладна ў два разы даражэйшая за нашы: ад прадуктаў да забаў, накшталт кіно, — кажа дызайнер. — Гэта, напэўна, галоўная складанасць. Усё астатняе не выклікае вялікіх цяжкасцяў. Вядома, там зусім іншая культура, таму да многага трэба прывучаць сябе з нуля — скажам, сартаваць абсалютна ўсё смецце. З той жа кухняй праблем не ўзнікала. Японцы харчуюцца ў асноўным рысам, локшынай і гароднінай, мяса ўжываюць няшмат.

## Нацыянальны кактэйль і музей без экспанатаў

Акрамя Рамана, у сям'і жылі аматары японскай мовы з самых розных краін: мексіканцы, бельгійцы, аргенцінцы, кітайцы, датчане, італьянцы. Летам на некалькі месяцаў спыняліся беларусы — каля двух дзясяткаў чалавек. Менавіта іншыя студэнты і былі галоўнымі сябрамі хлопца на працягу ўсяго перыяду. Паводле яго слоў, японцы, нягледзячы на сваю ветлівасць, не надта ахвотна ідуць на блізкі кантакт з незнаёмцамі, асабліва замежнікамі. Аднойчы Раман кантактаваў з амерыканцам, які жыве ў Токіа ўжо каля сямі гадоў. Той прызнаўся, што мясцовыя толькі цяпер патроху пачалі прымаць яго ў сваю кампанію, бо нарэшце звыкліся з думкай, што госць ужо не з'едзе.

Турыстычная праграма хлопца была адносна невялікай, але ў яе ўвайшло наведванне парку і музея міру, што ў Хірасіме. Па словах Рамана, галоўнае ўражанне пакідаюць не экспанаты, а іх практычная адсутнасць — пасля ядзернага выбуху важных артэфактаў амаль не засталося. Большасць экспазіцыі складаюць фотаздымкі і тэкставая інфармацыя. Таксама вандроўнікі наведалі мясцовую оперу (слухаць «Мадам Батэрфляй» па-італьянску і чытаць субцітры па-японску — задача не з простых, калі хочаш зразумець сюжэт) і востраў Міядзіма, вядомы яшчэ як востраў Храмаў. Акрамя саміх свяцілішчаў, на ім знаходзяцца сотні торый (рытуальных брам), якія лічацца сімвалам Японіі.

## У гасцях добра, але дома — сям'я

У хуткім часе пасля прыезду Раман уладкаваўся на работу. З будучым работадаўцам ён пазнаёміўся, калі ў вольную хвіліну прыйшоў на мітап — мерапрыемства, дзе сустракаюцца людзі з розных сфер, каб наладзіць кантакты і проста пагутарыць пра біznес. Хлопец загаварыў з адным з удзельнікаў, які, як высветлілася, займаецца распрацоўкай праграм. Адзін з праектаў — праграма для



Быў у Японіі і не бачыў квітнеючую сакуру — лічы, не бачыў нічога.

вывучэння японскай мовы. І вось супадзенне — яны шукалі сабе новага дызайнера. Так у Рамана з'явілася праца і добры заробак, што дазваляла замацавацца ў Японіі надоўга. Тым не менш у выніку ён усё ж вярнуўся на радзіму.

Нягледзячы на некалькі гадоў вывучэння японскай мовы, складанасцяў хапала. Напрыклад, хлопец не мог банальна аформіць банкаўскую картку, бо не здолеў запоўніць папяровую анкету. Для больш-менш свабоднага чытання трэба памятаць не менш за 3000 іерогліфаў і 6000 — для дасканалага. Калі ўзнікалі праблемы, Раман карыстаўся афлайнавым перакладчыкам на смартфоне, у якім можна маляваць сімвалы. Добра, калі размаўляць даводзілася са знаёмымі, якія ўсё разумелі і цярпліва чакалі, пакуль хлопец знойдзе патрэбны выраз у слоўніку, але часам размова банальна не складвалася.

— Праз чатыры-пяць месяцаў я зразумеў: хачу дадому, — успамінае хлопец. — Так, Японія — проста шыкоўная краіна. Нават калі ўспомніць прыроду, яна там значна больш разнастайная. Але мне не хапала галоўнага — сям'і і сяброў. Навошта ўсе гэтыя эмоцыі, калі імі няма з кім падзяліцца? Згодны, сёння без праблем можна камунікаваць са знаёмымі, нават знаходзячыся за тысячы кіламетраў адно ад аднаго, але гэта не тое. Таму я сабраў рэчы, купіў зваротны білет і паляцеў у Беларусь. Ідэю з японскай мовай я не закінуў, спрабую вучыць яе далей, але гэта паездка дапамагла мне зразумець, наколькі я люблю сваю краіну.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Нечакана!*

# «СВАЮ БУДУЧЫНЮ БАЧУ Ў ВАС»

## Як краіна змяніла японца Хітошы

**За час навучання ў Інстытуце журналістыкі БДУ Хітошы Танака стаў сапраўднай «зоркай» не толькі свайго курса. Мы даведалася ў пяцікурсніка, у чым яго сакрэт і якія планы ён мае на будучыню.**

— Летам я атрымаю дыплом спецыяліста. Таму, азіраючыся назад, магу ўпэўнена сказаць: мая вучоба ў Беларускім дзяржаўным універсітэце — гэта нешта неверагоднае! Я ехаў у Мінск, бо проста хацеў дасканала авалодаць рускай мовай, але ў дадатак да гэтага адкрыў для сябе краіну, якая так моцна адрозніваецца ад маёй радзімы, — дзеліцца Хітошы. — Хоць і Беларусь у некаторым сэнсе стала для мяне цяпер роднай. Яна моцна паўплывала на мяне як на асобу: я адмовіўся ад скрытнасці, якая ўласцівая ўсім японцам, і стаў больш простым і шчырым у адносінах з людзьмі.

Трыццацітрохгадовы студэнт з усмешкай прыгадвае, як некалькі гадоў таму выкладчыкі раілі яму навучыцца хваліць самога сябе: «А то хто пра цябе даведаецца, калі ты маўчыш?» І тады Хітошы пачаў «гаварыць» на старонках беларускіх газет і ў сюжэтах на тэлебачанні:

— У вас многія людзі захапляюцца культурамі краін Усходу. Гэта дапамагала мне рабіць першыя крокі ў журналістыцы: я рыхтаваў матэрыялы пра тое, што добра ведаю, — пра Японію, японцаў, нашы традыцыі і святы, — кажа пяцікурснік. — Акрамя таго, мне неаднаразова даводзілася праводзіць чайныя цырымоніі, майстар-класы па прыгатаванні сушы і нават вучыць беларусаў азам японскай каліграфіі.

Разам з тым малады журналіст пастаянна паглыбляецца ў нашу культуру: наведвае розныя гарады, адзначае беларускія святы разам са сваімі сябрамі і нават зацікавіўся праваслаўнай рэлігіяй.

— Я не рэлігійны чалавек, але час ад часу хаджу ў храм свяціцеля Мікалая Японскага, які знаходзіцца ў Мінску. Думаю, што калі аднойчы і захачу прыняць якую-небудзь веру, то гэта, хутчэй за ўсё, будзе праваслаўе.

Нават падчас практыкі Хітошы заўсёды заставаўся ў Мінску (хоць звычайна студэнты-замежнікі едуць дадому), супрацоўнічаў з газетамі, рыхтаваў сюжэты для тэлебачання.

— Я жыву ў інтэрнацы і заўважыў, што многія студэнты амаль бязвылазна сядзяць там каля сваіх камп'ютараў. Мне падаецца гэта няправільным. Я, шчыра кажучы, лічу, што інтэрнат — гэта месца, дзе трэба толькі спаць і есці, а не бавіць там увесь час. Таму для сябе вырашыў, што нават інтэрнэт у сваім пакоі падключаць не буду, каб не было спакусы ў ім застацца. Дарэчы, такі падыход матывуе мяне амаль кожны дзень хадзіць у бібліятэку, — дзеліцца Хітошы.

Яго імя часта гучыць на занятках у Інстытуце журналістыкі: выкладчыкі любяць ставіць японца ў прыклад не толькі іншым замежным студэнтам, але і беларусам. Сам пяцікурснік рэагуе на гэта спакойна:

— Быць добрым студэнтам — гэта адно, а стаць пасля выпуску добрым спецыялістам — зусім іншае. Сёння ўсе мае сілы скіраваны на пошукі працы ў Мінску. Гэта няпроста, паколькі сёлета з факультэта журналістыкі выпускаюцца адразу два курсы — пяты і чацвёрты — у сувязі з пераходам на



чатырохгадовае навучанне. Да таго ж у мяне склалася ўражанне, што работадаўцы «баяцца» замежнікаў, — адзначае Хітошы. — Таму цяпер я нават гатовы ўзяцца за работу і не па спецыяльнасці. Скажам, быць перакладчыкам. У любым выпадку я не адчайваюся і спадзяюся, што змагу застацца ў Беларусі.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**




# ЮНКАРЫ, УВАГА!

**Згодна з умовамі правядзення нашага творчага конкурсу, прыём «проб пяра» ад юных і маладых нештатных аўтараў быў завершаны ў пачатку месяца. Усяго іх паступіла некалькі дзясяткаў. На жаль, не ўсе дасланыя работы адпавядалі заяўленым патрабаванням, тым не менш, лепшыя з іх з'яўляліся на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены» па-за конкурсам — у якасці звычайных журналісцкіх матэрыялаў. Па традыцыі пэўная колькасць «проб пяра» паступіла ў апошні момант. Таму ў наступных нумарах маладзёжнага дадатку мы працягнем друкаваць найлепшыя з іх. Нагадваем, што вынікі конкурсу будуць падведзены да пачатку ўступнай кампаніі, каб пераможцы ці пераможцы, калі яны сёлета збіраюцца паступаць на журфак, змаглі апроч памятных прызоў атрымаць ад рэдакцыі яшчэ і рэкамендацыю, а іншыя ўдзельнікі — публікацыі для свайго партфоліа. Сачыце за «Чырвонкай. Чырвонай зменай»!**

# ЭКСТРЫМ НА ДВУХ КОЛАХ

**Прагулка — выдатны занятак, каб вырвацца з сусветнага павуціння. Ты шпацыруеш па «Брадвеі» (так маладзечанцы называюць пешаходную вуліцу), у слухаўках гучыць любімая музыка, а ў галаве лунаюць думкі: як жа добра вакол, які ж прыгожы наш парк з дарожкамі, невялікімі вадаёмамі. Горад ажывае, калі на вуліцу выходзіць моладзь: гутараць, іграюць на гітары, спяваюць, танцуюць і не толькі!**



Вы б толькі бачылі, якія «выкрутасы» на веласіпедах могуць вырабляць нашы юныя маладзечанцы: скачкі, павароты і кульбіты на «жалезным кані» прымушаюць мінакоў заміраць у захапленні! Адно з сучасных захапленняў моладзі называецца BMX. Даслоўна гэтая абрэвіятура азначае «веласіпедны мотаэкстрым». Экстрэмальнае велаваджэнне ўпершыню з'явілася ў 70-я гады XX стагоддзя ў Амерыцы, а з 2008 года BMX лічыцца алімпійскім відам спорту.

Адным з яркіх прадстаўнікоў гэтай маладзёжнай культуры з'яўляецца Антон Каўбаска, адзінаццацікласнік маладзечанскай гімназіі №7. Ён у «сядле» ўжо тры гады. Пачынаў з самых простых трукаў, а цяпер у яго арсенале іх больш за сто, і становіцца ўсё больш. Не стаяць на месцы, а пастаянна рухацца наперад дапамагае прыклад каліфарнійскіх райдараў Stevie Churchill, Brandon Begin, Dillon Lloyd, Chad Kerley і многіх іншых.

**ПРА АЎТАРА**

Сама сябе 16-гадовая аўтарка лічыць творчай асобай: спявае, летась скончыла музычную школу па класе фартэпіяна.

— Захапляюся прыродай, асабліва люблю заходы сонца. Імкнуся захаваць усю прыгажосць вакол сябе на фота. Жыву па прынцыпе: кожны дзень — гэта твой выбар! І ён за мной! — кажа Ангеліна. У будучым яна марыць стаць журналістам.

Сапраўдным асам Антон з'яўляецца ў такім кірунку, як street-riding. Для выканання трукаў ён выкарыстоўвае лаўкі, прыступкі, парэнчы, дахі і г. д. Каб бачыць прагрэс у катанні, дзяліцца вопытам і захоўваць відэа на памяць, юнак завёў свой канал на YouTube.

Веласіпеды для гэтага віду спорту адрозніваюцца ад звычайных. У іх палегчаная і нізкая рама, невялікія колы, а руль можа паварочвацца больш за 360 градусаў. Адно з галоўных адрозненняў — геаметрыя, якая дазваляе размяркоўваць нагрузку.

— Многія пытаюцца, для чаго патрэбныя тыя ці іншыя прылады ў маім веласіпедзе. Напрыклад, адмысловыя ўпоры для ног (пегі) мы выкарыстоўваем для выканання трукаў або для таго, каб слізгаць па паверхнях прадметаў, — тлумачыць Антон. — Некаторыя думаюць, што на ім нязручна перасоўвацца па вуліцах. Я скажу, што па горадзе, наадварот, хутчэй, бо дзе-небудзь можна скараціць шлях, пераскочыўшы цераз перашкоду, не трэба спыняцца перад бардзюрамі і г. д.

Першым турнірам, у якім Антон прыняў удзел і адразу перамог, быў міжнародны праект Game Of BIKE Online. Арганізатары з Расіі выбралі чатырох удзельнікаў, і кожны па чарзе прыдумляў для сапернікаў трукі, якія яны павінны былі паўтарыць па прынцыпу двух сутак.

Затым было яшчэ шмат дыстанцыйных конкурсаў, але больш за ўсё ўразіў пакінуў BMX кантэст «Little Belarussion Woodward» у сувязі з адкрыццём летась скейт-парку ў Мінску.

— Рэальныя гледачы, іх падтрымка, абсталяваная пляцоўка і толькі дзве спробы для манеўру — вось гэта было відовішча! Не чакаў, што займу першае месца ў сваёй катэгорыі, — дзеліцца ўражаннямі Антон.

У родным горадзе ў юнака шмат аднадумцаў. Бо катанне — не толькі вучыць трукі, гэта і стасункі, і паездкі, і новыя знаёмствы. Юнакі імкнуцца катацца разам, дзеляцца вопытам і марыць пра скейт-парк. А яшчэ іх усіх аб'ядноўвае здаровы лад жыцця, бо BMX — гэта спорт, які развівае фізічна і духоўна.

**Ангеліна ПЯТРОЎСКАЯ,**
**вучаніца 10 класа Лебедзеўскай СШ Маладзечанскага раёна.**

# ТЫЯ ПАШТОЎКІ — ЯК КРЫЛЫ ДЛЯ МАРЫ

**Любоў да людзей — гэта і ёсць тыя крылы, на якіх чалавек падымаецца вышэй за ўсё. Гэтыя словы вядомага класіка Максіма Горкага я прыгадала, калі пазнаёмілася з Віялетай Банковіч і яе гісторыяй. Апошнім часам у дзяўчынкі нібы выраслі крылы. Кожную раніцу яна прачынаецца з радасным чаканнем цуду і пытаецца: «Матуля, а сёння ты зазірала ў паштовую скрыню?»**



Не так даўно Віта захапілася посткросінгам. Усё пачалося з таго, што сябар сям'і расказала ў сацыяльных сетках пра дзяўчынку з асаблівасцямі развіцця і папрасіла падтрымаць яе. Мноства людзей з задавальненнем адгукнуліся, і ўжо праз некаторы час Віялеце сталі прыходзіць лісты з розных куткоў свету. Кожнае пасланне дзяўчынка чытае з асаблівым трапятаннем і ўвагай. Для Віялеты гэта не проста малюнкі, а адзіная на сённяшні момант магчымасць «пабываць» у розных гарадах і краінах. На іх перад Вітай «распасціраюцца» абшары Расіі, Украіны, Кыргызстана, Азербайджана, Арменіі, Бельгіі, Германіі. Дзякуючы паштоўкам дзяўчынка ўбачыла, напрыклад, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт на Ваваб'ёвых горах, уразілася незвычайнай прыгажосцю Карэльскага краю і нават «апынулася» каля падножжа гары Арарат.

**ПРА АЎТАРА**

— У мяне ёсць некалькі хобі. Адно з іх — журналістыка, якой займаюся ўжо два гады, — расказвае 16-гадовая аўтарка. — Таксама ў вольны ад вучобы час пляту бісер. Гэта чароўна, калі хаатычна раскіданы бісер пераўтвараецца ў нешта прыгожае! Летам я вельмі люблю падарожнічаць. Ніколі не забуду, як мы ездзілі на экскурсію ў Маскву, наведалі сядзібу Сярэднікова, дзе некалі праводзіў свае летнія канікулы Міхаіл Юр'евіч Лермантаў, а ў нашы дні праходзілі здымкі серыяла «Закрытая школа». З кожнага падарожжа я вяртаюся з фотаздымкамі, перавагу аддаю макраздымцы.

Многія падышлі да паслання творча і зрабілі паштоўкі сваімі рукамі. Часам у канверце прыходзяць і лісты, што вялікая рэдкасць у наш час. «Дарагая Віялета! У цябе вельмі прыгожае імя, ты ўнікальная, выдатная, проста супер! Поспехаў табе ў жыцці. У цябе будзе ўсё добра!» — пішуць дзве дзяўчынкі з Пермі, Каця і Паліна.

Але з велізарнай колькасці паштовак Віта вылучае самую любімую — з мілым вожыкам, таму што вельмі любіць жывёл. Летась сям'я абзавялася новым сябрам.

— Аднойчы мы з мамай вярталіся дадому з прагулкі і знайшлі каля пад'езду маленькае кацяня. Яно было параненае, і мы проста не змаглі прайсці міма, — успамінае Віёла.

Гаспадары накармілі, абагрэлі і прылашчылі новага члена сям'і, а ён, у сваю чаргу, адплаціў сваёй любоўю: калі дзяўчынцы сумна або проста дрэнны настрой, Фёдар (так назвалі гадаванца) усаджваецца на калені і пачынае «падпрацоўваць псіхатэрапеўтам».

Усе, хто знаёміцца з гэтай цудоўнай дзяўчынкай, адкрываюць яе як цікавага і рознабаковага чалавека, які мае незлічоную колькасць хобі. Большую частку вольнага часу займае маляванне, і часцей за ўсё на альбомных лістах юнай мастачкі з'яўляюцца яе любімыя поні. У будучыні Віта марыць стаць мультыплікатарам і ўжо зараз выношвае ідэю для свайго твора.

Сярод шматлікіх захапленняў Віялеты знайшлося месца і hand made. Дэкупаж, канзашы, валенне, вырабы з бісеру — што толькі не робіць яе ўмелыя рукі! І ўсяму гэтаму яе вучыць педагог цэнтра творчасці «Маладзік» Тацццяна Баляславаўна Рамановіч. Дарэчы, работы юнай рукадзельніцы не аднойчы былі адзначаныя дыпламамі на раённых і абласных конкурсах.

Актыўнасці і аптымізму Віялеты можна пазайздросціць. Па суботах дзяўчына займаецца маляваннем, музыкай і шашкамі. Яе часта запрашаюць на розныя мерапрыемствы. Напрыклад, яе чароўны голас гучаў на маладзёжным праваслаўным дабрачынным балі «Стрэчанне» ў Палацы культуры. Неўзабаве планецца яшчэ некалькі выступленняў перад дзецьмі з асаблівасцямі развіцця. А нядаўна Віта запісала песню на англійскай мове, якую будзе выконваць у Мінску ў рамках праекта, арганізаванага Беларускім дзіцячым хоспісам.

Калі нешта не атрымліваецца і хочацца апусціць рукі, Віялета ўспамінае цёплыя і душэўныя словы з самаробнай паштоўкі, дасланай ёй з Бельгіі: «Не пераставай марыць, атрымлівай задавальненне ад сваіх хобі, развівайся і не здавайся ніколі. Трымаю за цябе свае кулачкі».

Цяпер мары і мэты дзяўчынкі сталі больш рэальнымі дзякуючы новай спецыяльнай калясцы, сродкі на якую збіраліся амаль год. На просьбу сям'і адгукнуліся не толькі суайчыннікі, але і грамадзяне іншых краін. І гэта не дзіўна, бо міласэрнасць не ведае межаў.

**Ірына БУБНОВА,**
**вучаніца 10 класа СШ №12 г. Маладзечна.**

# ПЕРАМОЖНЫ «ФЛОТ» АРЦЁМА



**...На карме карабля лунае сцяг. Выратавальныя шлюпкі, гарматы, катапульты, катары — усё гатова, і, здаецца, вось-вось італьянскі крэйсер «Пола» спусціцца на марскую роўнядзь і зноў, як у часы Другой сусветнай вайны, прыступіць да ваенных дзеянняў. Але гэтага не адбудзецца, бо перад намі ўсяго толькі дакладная копія карабля, паменшаная ў 350 разоў, якую зрабіў юны маладзечанец Арцём Шахно.**

У цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік» яго прывёў тата Віталь Станіслававіч, які кіруе гуртком «Тэхнічнае мадэляванне». Першую мадэль — карабель з пластыку — пяцігадоваму Арцёму дапамагалі рабіць старэйшыя і больш вопытныя навучэнцы. З часам хлопчык так захапіўся мадэляваннем, што стаў наведваць і іншыя гурткі пад кіраўніцтвам Мікалая Мікалаевіча Хрэшчыка. У дванаццаць гадоў юнак стаў кандыдатам у майстры спорту. А нядаўна выканаў нарматыў майстра спорту і пры яго пацвярджэнні атрымае гэтае званне.

За дзесяць гадоў Арцём сабраў вялікую колькасць узнагарод: 35 медалёў, 6 кубкаў, каля 100 грамат. Неаднаразова ўдзельнічаў у рэспубліканскіх спаборніцтвах, а летась стаў прызёрам чэмпіянату Еўропы па стэндавым мадэлізме.

Калі я папрасіла Арцёма падлічыць колькасць зробленых ім мадэлі, ён на хвіліну задумаўся, уяўляючы свой «флот», але ў выніку адказаў: «Вельмі шмат, іх нерэальна падлічыць».

— Усім, хто плануе заняцца мадэляваннем, я хачу пажадаць цярплівасці, таму што без яе ў такой справе не абысціся, — кажа юнак.

Каб пабудаваць адзін карабель, патрэбны год, а то і два. Так, шмат часу неабходна, каб зрабіць поўную копію, паўтарыць кожную дэталь да дробязяў, а іх можа налічвацца да трохсот. Да таго ж, усё трэба зрабіць акуратна і якасна.

— Перш чым пачынаць работу, я вывучаю інфармацыю пра рэальны карабель: год пабудовы, у якіх бітвах удзельнічаў і г. д. Потым ідзе чытанне чарцяжа. Асаблівую ўвагу трэба надаць колерам і дробным дэталям, — расказвае Арцём.

**ПРА АЎТАРА**

Гэта ўжо другая па ліку работа 17-гадовай аўтаркі на наш творчы конкурс (умовамі яго правядзення гэта дазваляецца). Нагадаем, сёлета дзяўчына збіраецца паступаць на журфак.

— Мне падабаецца шукаць новых герояў, пра якіх цікава пісаць і, спадзяюся, чытаць, — гаворыць Ангеліна. — Пра сябе магу дадаць, што люблю чытаць творы англійскіх пісьменнікаў, асабліва Мэры Карэлі. Слухаю класіку рока: «Queen», «The Beatles», «Scorpions», «Pink Floyd» і г. д.

